Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма
Цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

СЕРЫЯ «ВЕДАЙ І ЛЮБІ СВОЙ ГОРАД»

ДА 730-ГОДДЗЯ З ЧАСУ ПЕРШАГА ЎПАМІНАННЯ
КОБРЫНА Ў ІПАЦЬЕЎСКІМ ЛЕТАПІСЕ

# Імёны тваіх вуліц, ГОРАД КОБРЫН

***ДАВЕДНІК-ТУР ПА ВУЛІЦАХ***

Кобрын
2017

УДК 913(476.7)(035)
ББК 26.89(4Беи)
И51

Серыя заснавана ў 2017 годзе

***Складальнік:***

галоўны бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай раённай бібліятэкі дзяржаўнай установы культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» *С. Д. Курачук*

И51 **Імёны тваіх вуліц, горад Кобрын** : даведнік-тур па вуліцах да 730-годдзя з часу першага ўпамінання Кобрына / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – Кобрын, 2017. – 70 с. : каляр. фат. – (Серыя «Ведай і любі свой горад»).

Даведнік-тур па вуліцах, які прысвечаны 730-годдзю з часу першага ўпамінання Кобрына ў Іпацьеўскім летапісе, дае цікавую і карысную інфармацыю пра назвы вуліц горада ў мінулым і сучасным.

**УДК 913(476.7)(035)**
**ББК 26.89(4Беи)**

© Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, 2017

# АД СКЛАДАЛЬНІКА

Мы спяшаемся па гарадскіх вуліцах, часам не заўважаючы іх назваў. А ў кожнай вуліцы, як у чалавека, сваё «прозвішча», свой твар, характар, гісторыя...

Ці ведаеце вы, што ў горадзе Кобрыне 3 плошчы, 173 вуліцы, 80 завулкаў, а працягласць гарадской вулічнай сеткі, дарожных «артэрый» нашага горада сёння складае 190 км?

Горад Кобрын мае сваю адметнасць. Імклівы бег часу ўсё далей адводзіць нас ад ціхага, непрыкметнага мястэчка пад назвай Кобрын. Ранейшае аблічча горада засталося ў мінулым і беражна захоўваецца ў архівах, Кобрынскім ваенна-гістарычным музеі імя А. В. Суворава, раённай бібліятэцы.

За апошнія гады Кобрын змяніў свой выгляд, прыкметна папрыгажэлі яго вуліцы. Упрыгожылі горад новыя індывідуальныя забудовы. Расшырыліся, памаладзелі вуліцы, некаторыя з іх набылі статус пешаходнай, праспекта. Шпацыруючы па гарадскіх вуліцах, дзякуючы памятным дошкам у гонар абаронцаў Айчыны, дзяржаўных і палітычных дзеячаў, літаратараў, гістарычных падзей, мы спазнаем летапіс сваёй малой радзімы. Увогуле, такія вандраванні заахвочваюць паглыбіцца ў мінулае і па-новаму зірнуць на сучаснасць.

Пры складанні даведніка ***«Імёны тваіх вуліц, горад Кобрын»*** выкарыстоўваліся планы горада Кобрына, складзеныя ў 1798 г., 1810 г., 1858 г., польскі перыяд (1921-1939 гг.), 1957 г., 1962 г. і 2003 г., якія захоўваюцца ў фондах Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея імя А. В. Суворава; выпіскі з рашэнняў выканкама Кобрынскага райсавета дэпутатаў працоўных, Кобрынскага гарсавета дэпутатаў працоўных пра змены назваў вуліц горада; рашэнні Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў за розныя гады «Аб прысваенні найменаванняў вуліц, завулкаў у г. Кобрыне»; даныя Кобрынскага занальнага архіва; артыкулы А. М. Мартынава, Н. М. Пліско аб гісторыі кобрынскіх вуліц і іншыя матэрыялы. Крыніцай інфармацыі пра сярэдзіну XVI стагоддзя па дадзенай тэме стала «Рэвізія Кобрынскай эканоміі» 1563 года.

Даведнік-тур уключае два раздзелы: першы - «*Вуліцы горада расказваюць…*», другі - «*Я іду па гораду, па знаёмай вуліцы…*».

У першым раздзеле ідзе размова пра назвы вуліц Кобрына ў мінулым, іх гісторыю. Трэба адзначыць, што толькі невялікая колькасць кобрынскіх вуліц і завулкаў захавала старыя дарэвалюцыйныя назвы. Некаторыя вуліцы перайменоўваліся па 2-3 разы. Раздзел уключае схему змяненняў назваў вуліц, плошчаў Кобрына ў розныя часы

існавання горада, артыкулы А. М. Мартынава, Н. М. Пліско пра дарэвалюцыйныя вуліцы, фотагалерэю вуліц горада.

Другі раздзел «Я іду па гораду, па знаёмай вуліцы…» дае агульны пералік сучасных вуліц, завулкаў, плошчаў Кобрына на беларускай і рускай мовах. Таксама назвы вуліц згрупаваны тэматычна: персаналіі (дзяржаўныя дзеячы, гістарычныя асобы, ваенныя дзеячы, героі Вялікай Айчыннай вайны, касманаўты, лётчыкі, навукоўцы, пісьменнікі, літаратары), падзеі, геаграфічныя, мірныя, фруктова-ягадныя, кветкавыя і іншыя вуліцы.

У паказальніку шырока прадстаўлены ілюстрацыйны матэрыял у выглядзе планаў горада, малюнкаў вуліц, плошчаў, фотаздымкаў розных гадоў.

Даведнік-тур па вуліцах, які прысвечаны 730-годдзю з часу першага ўпамінання Кобрына ў Іпацьеўскім летапісе, дае цікавую і карысную інфармацыю пра назвы вуліц горада ў мінулым і сучасным.



# ВУЛІЦЫ ГОРАДА РАСКАЗВАЮЦЬ…

## НАЗВЫ ВУЛІЦ КОБРЫНА Ў МІНУЛЫМ

*На шматлікіх планах горада Кобрына і паштоўках розных гадоў мы бачым зусім іншыя хаты, вуліцы і плошчы. Упершыню дакументальныя звесткі пра вуліцы горада сустракаюцца ў «Рэвізіі Кобрынскай эканоміі», складзенай у 1563 г. Львом Сапегай. Сёння, якой бы дарогай вы не заязджалі ў Кобрын, яна абавязкова прывядзе вас на адну з гэтых старых вуліц. Яны шмат у чым змянілі сваё аблічча, не раз змянялі свае назвы, але захавалі штосьці ад даўно мінулых часоў…*

*Нельга не звярнуць увагу на тое, што ўжо ў сярэднявеччы назвы вуліц галоўным чынам адпавядалі тым населеным пунктам, у кірунку якіх яны пралягалі: Пінская, Раценская, Чаравачыцкая, Балоцкая, вуліца Над Кобрынкай, Астрамецкая, Берасцейская - менавіта так яны пазначаны ў дакументах «Рэвізіі Кобрынскай эканоміі» 1563 года. Таксама ў назвах вуліц адлюстроўваліся заняткі жыхароў: Бочкарская, Гарбарская, Завадская.*

*Наступныя даныя пра вуліцы запазычаны з планаў горада Кобрына, якія складзены ў 1798 г., 1810 г., 1858 г., 1903 г., польскі перыяд (1921-1939 гг.) (захоўваюцца ў фондах Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея імя А. В. Суворава).*

*Так, па плану Кобрына, складзенага ў 1798 годзе, вынікае, што горад папоўніўся невялікай колькасцю новых вуліц, па-ранейшаму прылеглых да цэнтра: Слушная (Базіліянская, 17 Верасня), Рачная (Беларуская), Губерніяльная, Прачысцінская (Школьная, Матросава), Спартыўная, Агародніцкая (Садовая).*

*З плана Кобрына 1903 г. даведваемся, якія новыя вуліцы з'явіліся ў горадзе. Гэта Бабруйская, палякамі перайменаваная ў вуліцу Пілсудскага, а пазней вуліца Леніна. Таксама вуліцы Падрэчча (Набярэжная), Чыгуначная, Тэвельская, Влодаўскае шасэ (вул. Дзяржынскага).*

*План мястэчка Кобрын польскага перыяду 1921-1939 гг. паказвае, што многія вуліцы былі перайменаваны. Захавалі ранейшыя назвы толькі Мікольская, Новая і Влодаўскае шасэ. У 20-х гадах XX ст. утварыліся дзве ўтульныя вуліцы, забудаваныя асабнякамі польскіх чыноўнікаў. Гэта Клапоцін (ад слова «клопаты»), перайменаваная ў Піянерскую, і Кветкавая. У той жа перыяд у канцы Пінскай вуліцы была пракладзена Чырвонагвардзейская вуліца.*

## ВУЛІЦЫ, УКАЗАНЫЯ Ў СПІСЕ ДОМАЎЛАДАННЯЎ І НЕЗАБУДАВАНЫХ ЗЯМЕЛЬНЫХ УЧАСТКАЎ г. КОБРЫНА *па стане на 1 студзеня 1941 года*

1. плошча 11 ліпеня (сучасная Замкавая)
2. вул. Першамайская
3. вул. Чырвонаармейская

4. вул. Свярдлова
5. вул. Кірава
6. вул. Кастрычніцкая
7. вул. Камсамольская
8. вул. Працоўная
9. вул. Рэспубліканская
10. вул. Інтэрнацыянальная
11. вул. Мопраўская
12. вул. Рэвалюцыйная (сучасная Суворава)
13. вул. Пушкінская (сучасная Пушкіна)
14. вул. Піянерская
15. вул. Влодаўскае шасэ (сучасная Дзяржынскага)
16. вул. Савецкая
17. вул. Спартыўная
18. вул. 8 Сакавіка (скасавана)
19. вул. Школьная (сучасная Матросова)
20. завулак Брэсцкі (скасаваны)
21. вул. Беларуская
22. вул. 17 верасня
23. Ленінская (да моста) (сучасная Леніна)
24. Плошча Свабоды

## ІНВЕНТАРНЫЯ КНІГІ ДОМАЎЛАДАННЯЎ
## *за 1946-1948 гг.*

1. вул. Пралетарская
2. вул. Чыгуначная
3. вул. Малая Чыгуначная
4. вул. Ленінская (сучасная Леніна)
5. вул. Тэвельская
6. вул. Камуністычная (сучасная Мікольская)
7. вул. Набярэжная
8. вул. Савецкая
9. вул. Спартыўная
10. вул. Рэвалюцыйная (сучасная Суворава)
11. вул. Інтэрнацыянальная
12. вул. Працоўная
13. вул. Камсамольская
14. вул. Беларуская
15. вул. Влодаўскае шасэ (сучасная Дзяржынскага)

16. вул. Кірава
17. вул. Свярдлова
18. вул. Школьная (сучасная Матросова)
19. вул. 17 верасня
20. вул. Пушкінская (сучасная Пушкіна)
21. плошча Свабоды
22. вул. Першамайская
23. вул. Чырвонаармейская
24. плошча 11 ліпеня (сучасная Замкавая)
25. вул. Чырвонагвардзейская
26. вул. Кастрычніцкая

*У перыяд з 1945 па 1957 г. з'явіліся вуліцы: Авіяцыйная (сучасная Марозава), Мажайскага, Зялёная, Някрасава, Лермантава, 8 Сакавіка (скасавана), Дзекабрыстаў, Панфілаўцаў, Касмадзям'янскай, Жданава (перайменавана ў 1989 г. у вул. Жукава), Гастэла, Мопраўская, Чкалава, Леванеўскага, Паркавая, Новая (сучасная Данілеўскай), Камсамольская, Мічурына, Горкага, Свярдлова, Палявая, завулкі Коласа і Крупскай (скасаваны), значна падоўжыліся вуліцы Інтэрнацыянальная і Влодаўскае шасэ.*

*У адрозненні ад папярэдняга плана г. Кобрына, складзенага ў 1957 годзе, на плане 1962 года нанесена на два дзясяткі вуліц больш. Акрамя таго, на плане 1962 года ў цэнтры горада абазначана плошча Суворова (перайменавана 10 мая 1962 г. у плошчу імя Леніна) і два паркі: парк імя Суворвава ў паўднёвай частцы горада і парк імя 40 год Кастрычніка (паміж вуліцамі Чыгуначнай і Леніна). Дарэчы, галоўнай асаблівасцю назваў вуліц таго часу стала іх адпаведнасць савецкаму перыяду ў гісторыі нашага горада: Савецкая, Пралетарская, Першамайская, Камуністычная, Інтэрнацыянальная і г. д.*

# СХЕМА ЗМЯНЕННЯЎ НАЗВАЎ ВУЛІЦ, ПЛОШЧАЎ КОБРЫНА

## В У Л ІЦ Ы

### *САВЕЦКАЯ*

1. Чаравачыцкая (1563 г.)
2. Брэсцкая (1798 г.)

3. Легіёнаў (30-я гг. XX ст.)
4. Пярацкага (пасля 1934 г.)
5. Савецкая (1939 г. - па цяперашні час)

## ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАЯ

1. Раценская (1563 г.)
2. Дзівінская (народная назва)
3. Славянская (1864 г.)
4. Ратненская (30-я г. XX ст.)
5. Пярэца (1939 г.)
6. Інтэрнацыянальная (1941 г. - па цяперашні час)

## ПЕРШАМАЙСКАЯ

1. Пінская (1563 г.)
2. Усходняя (1915-1918 гг.)
3. 3 Мая (30-я гг. XX ст.)
4. Першамайская (1939 г. - па цяперашні час)

## ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ

1. Балоцкая (1563 г.)
2. Бочкарская ці Блоцкая (1798 г.)
3. Бочарная (1810 г.)
4. Гарбарская (1858 г.)
5. Завадская (1864 г.)
6. Петрапаўлаўская (1912 г.)
7. Польная (30-я гг. XX ст.)
8. Чырвонаармейская (1939 г. - па цяперашні час)

## КАСТРЫЧНІЦКАЯ

1. Вуліца Над Кобрынкай (1563 г.)
2. Агародніцкая (1798 г.)
3. Мяшчанская (1864 г.)
4. Гродзенская (пачатак XX ст.)
5. Мяшчанская (1902 г.)
6. Кобрынская (30-я гг. XX ст.)
7. Кастрычніцкая (1939 г.- па цяперашні час)

## ПРАЛЕТАРСКАЯ

1. Берасцейская (1563 г.)
2. Ганчарная (1798 г.)
3. Ганчарская (1858 г., 1903 г.)
4. Ганчарная (1864 г.)
5. К.-Бярнацкага (30-я гг. XX ст.)
6. Пралетарская (1946 г.)

## МІКОЛЬСКАЯ

1. Астрамецкая (1563 г.)
2. Мікольская (1798 г.)
3. Міколенская, Мікалаеўская (1864 г.)
4. Камуністычная (1939-1990-я гг.)
5. Мікольская (1990-я гг.)

## 17 ВЕРАСНЯ

1. Слушная (1798 г.)
2. Шлюзная (1810 г.)
3. Васіліянская (1903 г.)
4. Кляштарная (30-я гг. XX ст.)
5. 17 Верасня (1941 г. - па цяперашні час)

## МАТРОСАВА

1. Малая ад рынка да царквы Прачысценскай (1798 г.)
2. Прачысценская (1864 г.; 1903 г.)
3. Школьная (30-я гг. XX ст.)
4. Матросава (20.10.1948 г. - па цяперашні час)

## СУВОРАВА

1. Губернская (1798 г.)
2. Паштовая (1810 г.)
3. Губерніяльная (1858 г.)
4. Сувораўская (1864 г.)
5. Траўгутава (30-я гг. XX ст.)
6. Рэвалюцыйная (1941 г.)
7. Ліндэнштрасе (1941-1944 гг.)
8. Рэвалюцыйная (1946 г.)
9. Суворава (26.06.1946 г. - па цяперашні час)

## БЕЛАРУСКАЯ

1. Рачная (1798 г.)
2. Рэзніцкая (до 1864 г.)
3. Гразная (пасля 1864 г., 1903 г.)
4. Крывая (30-я гг. XX ст.)
5. Беларуская (1941 г. - па цяперашні час)

## ЛЕНІНА

1. Пружанская (д 1846 г.,)
2. Бабруйская (1846 г.)
3. Вуліца Перамогі (1915-1918 гг.)

4. Пілсудскага (30-я гг. XX ст.)
5. Ленінская (1941 г.)
6. Леніна (1957 г.)

## ДЗЯРЖЫНСКАГА

1. Влодаўскае шасэ (2-я палова XIX ст., 1903 г., 30-я гг. XX ст.; 1941 г., 1946, 1957 г., 1962 г.)
2. Дзяржынскага (29.07.1977 г.)

## ПУШКІНА

1. Садовая (XVIII ст., 1903 г.)
2. Агародніцкая (30-я гг. XX ст.)
3. Пушкінская (1941 г.;1946 г.)
4. Пушкіна (1957 г.)

## ЧЫГУНАЧНАЯ

1. Ясвельская (1903 г.)
2. Каляёвая (Колейовая) (30-я гг. XX ст.)
3. Чыгуначная (1946 г.)

## ЗАСЛОНАВА

1. Мастовая (1903 г.)
2. Каляёвая (Колейовая) (30-я гг. XX ст.)
3. Заслонава (20.10.1953 г., 1)

## СПАРТЫЎНАЯ

1. Новая (1903 г.; 30-я гг. XX ст.)
2. Спартыўная (1941 г – па цяперашні час)

## ПІЯНЕРСКАЯ

1. Клапоцін (20-я гг. XX ст.)
2. Піянерская (1941 г.- па цяперашні час)

## МАРШАЛА ЖУКАВА

1. Кветкавая (20-я гг. XX ст.)
2. Піянерская «А» (да 1948 г. )
3. Жданава (15.11.1948 г.)
4. Жукава (18.05.1989 г.)

## ПРАЦОЎНАЯ

1. Пекарская (30-я гг. XX ст.)
2. Працоўная (1941 г.)

## 8 САКАВІКА

1. Сярэдняя (30-я гг. XX ст.)
2. 8 Сакавіка (1941 г.; 1946 г., 1957 г.; 1962 г.)

## АЛЕГА КАШАВОГА

1. Роўная (30-я гг. XX ст.)
2. А. Кашавога (27.09.1955 г.)

## КУТУЗАВА

1. Тэвельская (30-я гг. XX ст., 1946 г., 1957 г., 1962 г.)
2. Кутузава (29.08.1962 г.)

## НАБЯРЭЖНАЯ

1. Падрэчча (30-я гг. XX ст.)
2. Набярэжная (1946 г.)

## КІРАВА

1. Кіндлера (30-я гг. XX ст.)
2. Кірава (1941 г.)

## ЧЫРВОНАГВАРДЗЕЙСКАЯ

1. Касцельны завулак (30-я гг. XX ст.)
2. Чырвонагвардзейская (1939 г.)

# П Л О Ш Ч Ы

## ПЛОШЧА СВАБОДЫ

1. Базарная (Рыначная) (1563 г.)
2. Гарадавая (1839 г.)
3. Плошча Свабоды (1939 г.)

## ЗАМКАВАЯ ПЛОШЧА

1. Замкавая (канец XVIII ст.)
2. Сенная (1902 г.; 1903 г.)
3. Камянданцкая (1915-1918 гг.)
4. Банкаўская (1912-1915 гг.; 30-я гг. XX ст.)
5. 11 Ліпеня (1941 г.; 1946 г.)

6. Плошча Камсамольская (20.10.1948 г.)
7. 700-годдзя Кобрына (19.08.1987 г.)
8. Замкавая (14.07.2003 г.)

## ПЛОШЧА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1. Плошча А. В. Суворава (да 10.05.1962 г., 1962 г.)
2. Плошча імя У. І .Леніна (пасля 10.05.1962 г.)

*Прапануем шэраг артыкулаў А. М. Мартынава, Н. М. Пліско, якія больш падрабязна раскажуць аб гісторыі дарэвалюцыйных вуліц горада Кобрына.*

**Мартынов, А. Что в имени твоем, улица? / Алексей Мартынов // Кобрынскі веснік. – 2002. – 27 ліпеня.**

# ЧТО В ИМЕНИ ТВОЁМ, УЛИЦА?

***Впервые документальные сведения об улицах нашего города встречаются в «Ревизии Кобринской экономии», составленной Львом Сапегой в 1563 году. К сожалению, в рукописном оригинале «Ревизии», хранящемся в Литовском историческом архиве, утеряны страницы, посвященные описанию центральной площади Кобрина, которая с южной стороны непосредственно примыкала к укреплениям оборонного замка. В наше время десяток улиц берут начало именно с этой площади, испокон веков бывшей подлинным сердцем города. В официальных источниках площадь именовалась либо Рыночной, либо Базарной. В 1939 г. она переименована в площадь Свободы.***




Говоря о названиях улиц, нельзя не обратить внимания на то, что уже в средневековье кобринчане, не мудрствуя лукаво, присваивали улицам имена тех населённых пунктов, в направлении которых улицы пролегали. Так, возникший в незапамятные времена оживлённый проезжий шлях из Пинска в Брест пролегал через Кобрин в виде двух улиц, тянувшихся параллельно течению Мухавца. Восточная часть превратилась в Пинскую улицу. Польская администрация переименовала её в улицу 3 Мая, а с 1939 г. она стала Первомайской. В западном направлении продолжение этой улицы в Ревизии именуется Черевачицкой, впоследствии (по-видимому, после строительства шоссе) стала называться Брестской. Поляки «окрестили» её в улицу Легионов, позже дали имя министра внутренних дел Перацкого, убитого революционером. А в 1939 году за ней закрепилось современное имя - Советская.

В южном направлении от нашей главной площади простиралась Ратненская улица. При очередном переименовании ряда городских улиц в начале двадцатого столетия она была названа Славянской, что звучало несколько с издёвкой, поскольку заселена была почти сплошь евреями. Однако реванш не заставил себя долго ждать. В тридцать девятом году улице присвоили фамилию видного еврейского писателя Переца. Но уже после войны вновь поменяли название - до сих пор она носит имя Интернациональной. Из того же юго-восточного угла площади отпочковалась ещё одна улочка. В виде исключения никуда не ведущая. В Ревизии названная предельно точно - «улица над Кобринкой». Впоследствии она величалась то Мещанской, то Кобринской, а последние полвека известна как Октябрьская.

И, наконец, на левобережьи есть пятая улочка, увековеченная Львом Сапегой. Её название подвергалось наибольшим изменениям. Ответвляясь от Пинской, улица вначале была Болоцкой, поскольку вела в деревню Болота. Позже в её именах отражались поочерёдно занятия жителей - Бочкарская, Гарбарская (кожевенная), Заводская (в то время, когда поблизости возникли кустарные кирпичные заводики). В связи с переносом на соседнее упразднённое кладбище древней Петропавловской церкви, первоначально находившейся на южной окраине Рыночной площади, улицу назвали Петропавловской. У поляков она стала Польской, а в 1939-м появилось современное название - Красноармейская.

Следующие данные заимствованы с плана Кобрина, составленного в 1798 г. Из него явствует, что за минувшие два столетия город пополнился лишь небольшим количеством новых улиц, по-прежнему примыкающих к центру.

К северу от Рыночной возникла ещё одна площадь - Замковая. В шестидесятых годах XIX века там был воздвигнут православный собор, а в 1912 году рядом с ним выстроено здание помещичьего банка. С той поры площадь получила новое имя - Банковая. Если следовать от моста через Мухавец, справа следует перечислить вереницу параллельных улиц. Первая из них, некогда огибавшая Замковую площадь, Слушная (то есть справедливая). Позже переименована в Базилианскую, а потом в улицу 17 Сентября. Следующая за нею - Речная, впоследствии переименованная в Малую свинскую, в просторечии «Свиньяче подречье». Спустя годы получила название Белорусской. В сторону Советской изогнулась Спортивная улица, в конце которой на речном берегу располагался примитивный стадион.

От Рыночной площади в 1766 году пролегла Губерниальная улица, ведущая к заложенной на городской окраине усадьбе административного имения Губерния. Когда имение перешло во владение Суворова, улица стала носить имя полководца. Поляки название поменяли в честь Траугутта. Однако ж имя Суворова было восстановлено опять же в 1939 году. В самом конце тогдашней Суворовской обазовалась скромная Огородницкая, затем Садовая. В первые послевоенные годы, когда возникла нынешняя площадь Ленина, улица получила название Пушкинской.

В 20-х годах на распродаваемых помещиком Зелинским полях имения Губерния возникли две уютные улочки, застроенные особняками польских чиновников. Это Клопоцин, переименованная в Пионерскую, и Цветочная, ставшая в 1939 г. ул. Жданова, замененная позже на имя маршала Жукова. В тот же период в конце Пинской к востоку от костельного парка была проложена Красногвардейская улица. Назвали её так потому, что осенью 39-го поблизости размещалось общежитие так называемой Красной Гвардии, которая поддерживала в городе общественный порядок до организации органов регулярной милиции.

Многократный рост населения сопровождался интенсивным расширением пределов Кобрина. Естественно, это влекло за собой рождение новых улиц. Знакомясь с перечнем современных городских улиц, испытываешь досаду. К столь серьёзному вопросу, как присвоение имени улице, у нас относились без должного внимания. Большинство имён не блещут оригинальностью и вряд ли могут претендовать на сохранность в веках...

*(Публикуется с сокращениями)*.

**Мартынов, А. Довоенные улицы Кобрина : страницы истории / А. Мартынов // Кобрынскі веснік. – 1993. – 9 студзеня. – С. 2.**

# ДОВОЕННЫЕ УЛИЦЫ КОБРИНА

Впервые документальные сведения о наших улицах встречаются в «Ревизии Кобринской экономии», составленной Львом Сапегой в 1563 году. К сожалению, в рукописном оригинале Ревизии, хранящемся в Литовском историческом архиве, утеряны страницы, посвященные описанию центральной площади Кобрина, которая с южной стороны непосредственно примыкала к укреплениям оборонного замка. В наше время десяток улиц берут начало именно с этой площади, испокон веков бывшей подлинным сердцем города. В официальных источниках площадь издавна именовалась либо Рыночной, либо Базарной. В 1939 году она переименована в площадь Свободы.

Говоря о названиях улиц, нельзя не обратить внимания, что уже в средне-вековье кобринцы, не мудрствуя лукаво, естественно присваивали своим улицам имена тех населенных пунктов, в направлении которых они пролегали. Так возникший в незапамятные времена оживленный проезжий шлях из Пинска в Брест пролегал через Кобрин в виде двух улиц, протянувшихся параллельно течению Мухавца. Восточная часть превратилась в Пинскую улицу. Польская администрация переименовала ее в улицу 3 Мая, а с 1939 года она стала Первомайской.

В западном направлении ее продолжение в Ревизии именуется Черевачицкой улицей, впоследствии (по-видимому, после сооружения шоссе) она сменила первоначальное название на Брестскую. Поляками эта улица называлась ул. Легионов, впоследствии улицей Перацкого (по имени министра внутренних дел, убитого революционером). С 1939 года за ней закрепилось современной имя «Советская».

В южном направлении от нашей главной Площади простирается Ратненская улица, названная именем волынского райцентра Ратно. Попутно уместно припомнить, что до возникновения самостоятельного Кобринского княжества в начале XVI столетия Кобринщина входила в состав Ратненского княжества. Наряду с официальным, в народе поныне распространено «самодеятельное» название – Дивинская улица. При очередном переименовании ряда городских улиц в начале XX столетия эта была названа Славянской, что звучало несколько издевательски, поскольку заселена была почти сплошь евреями. Впрочем, реванш не заставил себя долго ждать: в 1939 году улице присвоили фамилию видного еврейского писателя Переца, однако, вскоре после окончания войны улица стала Интернациональной. Из того же юго-восточного угла площади отпочковалась еще одна улица, в виде исключения ведущая в никуда. В ревизии она названа предельно точно: «Улица над Кобринкой». Впоследствии она величалась то Мещанской, то Кобринской, а последние полвека известна как Октябрьская.

И, наконец, на левобережье имеется пятая улица, увековеченная в Ревизии, название которой подвергалось наибольшим изменениям. Ответвляясь от Пинской, улица сперва была Болотской, поскольку вела в деревню Болота. Впоследствии в ее названиях поочередно отражались занятия жителей: Бочкарская, Гарбарская (Кожевенная), Заводская, когда вблизи возникли кустарные кирпичные заводики.

В связи с переносом на соседнее упраздненное кладбище древней Петропавловской церкви, которая первоначально стояла на южной окраине Рыночной площади, улицу назвали Петропавловской, у поляков она стала Польной, а с 1939 года появилось современное наименование – Красноармейская.

Наряду с пятью улицами левобережья в Заречьи Ревизией названы еще две. Идущая вдоль Мухавца на запад улица называлась Берестейской, потом Гошечной-Гончарской и наконец Пролетарской. Непосредственным продолжением этой улицы к востоку стала Остромичская, ведущая в сторону деревни Остромичи. По-видимому, с конца XVIII столетия, когда в начале ее выстроили Никольскую церковь, перенесенную из деревни, улица стала Никольской, а с достопамятного 1939 года «революционизировалась», обернувшись Коммунистической.

Здесь необходимо, как говорится, «внести ясность». Следует иметь в виду, что лишь с декабря 1846 года началась «гоньба» по законченному строительством Московско-Варшавскому шоссе, интегральной частью которого стала в границах города новая Бобруйская улица (ныне ул. Ленина). Поскольку довоенные мосты через Мухавец были низкими, подъем на них не требовал столь отдаленного «разбега», как это наблюдается в наше время. Поэтому Гончарная улица переходила в Никольскую на одинаковом уровне при пересечении с Бобруйской. К слову сказать, нынешний отрезок Пролетарской улицы от Ленинской до Железнодорожной образовался лишь в послевоенные годы.

Таковы вкратце сведения о наших древнейших улицах. Следующие данные заимствованы с плана Кобрина, составленного в 1798 году. Из него явствует, что за минувшие два столетия город пополнился лишь небольшим количеством новых улиц, по-прежнему непосредственно примыкающих к центру.

В связи с окончательным срытием в конце XVIII столетия Замковой горы к северу от Рыночной площади возникла Замковая площадь. В шестидесятых годах XIX столетия на части ее был воздвигнут православный собор, а в 1912 году рядом с ним выстроено здание помещичьего банка. С той поры площадь называлась Банковой, затем Комсомольской, а с 1987 года обрела новейшую табличку: 700-летия Кобрина.

Если следовать от моста через Мухавец, справа следует перечислить вереницу параллельных улиц. Первая из них, некогда огибавшая Замковую гору и мостом через Мухавец соединявшаяся с Берестейской, ул. Слушная (справедливая), ставшая впоследствии Базилианской, или Кляшторной (Монастырской), поскольку здесь находился Базилианский монастырь. В дальнейшем это улица 17 Сентября. Следующая за нею Речная улица впоследствии превратилась в Малую свинскую – в простонаречьи «Свиньяче подречье», - теперь же это Белорусская улица. Далее значится на плане Пречистенская улица. Название произошло от одноименной, впоследствии сгоревшей церкви, на месте которой выстроен хлебозавод. Впоследствии она значилась Школьной, теперь же это улица Матросова. И наконец, в сторону Советской изогнулась Спортивная улица, в конце которой на речном берегу располагался примитивный спортивный стадион.

Перейдем последовательно к южному направлению. От Рыночной площади в 1766 году пролегла Губерниальная улица, ведущая к недавно заложенной на городской окраине усадьбе административного имения Губерния. В 1795 году имение перешло во владение полководца А. В. Суворова, жившего здесь в 1797 и 1800 гг.

Его имя впоследствии получила улица. Поляками она была переименована в ул. Р. Траугутта, а имя Суворова восстановлено в 1939 году.

В самом конце тогдашней Суворовской улицы образовалась скромная Огородницкая, затем Садовая улица. В первые послевоенные годы, когда в юго-западном углу Рыночная площадь получила напрямую соединение с Садовой – тогда же возникла нынешняя площадь Ленина, – последняя получила название Пушкинской.

Очередной наш ориентир – план Кобрина 1903 г., сопоставляя который с предыдущим узнаем, какие новые улицы появились за истекшее столетие. Это уже упоминаемая ранее Бобруйская, поляками переименованная в улицу Пилсудского, а впоследствии ставшая улицей Ленина. Далее, на правобережье Мухавца отмечена односторонняя улица Подречье, благодаря обновленческому задору вряд ли удачно названная Набережной. В ту же пору на Замухавце появились еще две улицы – Железнодорожная и Тевельская. А во второй половине XIX столетия от Брестского шоссе в южном направлении было проложено стратегического назначения Влодавское шоссе (конечный пункт польский город Влодава). Его отрезок в черте города назывался Влодавской улицей, впоследствии обретшей имя Дзержинского.

И, наконец, самый последний этап нашего краткого обзора. В 20-х годах на распродаваемых помещиком Зелинским полях имения Губерния образовались две уютные улицы, застроенные особняками польских чиновников. Это Клопоцин (от слова «хлопоты»), переименованная в Пионерскую, и Цветочная, ставшая в 1939 году улицей Жданова, одиозная фамилия которого недавно была заменена именем маршала Жукова. В тот же период в тогдашнем конце Пинской улицы к востоку от костельного парка была проложена Красногвардейская улица. Объясняется это название тем, что осенью 1939 года у ее начала по Первомайской улице размещалось общежитие так называемой Красной гвардии, поддерживающей в городе общественный порядок до ор-ганизации органов регулярной милиции.

С довоенных лет, когда число городских улиц едва перешагнуло за два десятка, тогда как население устойчиво держалось на отметке 11-12 тысяч, прошло всего полвека. Для многовековой истории Кобрина не так уж много. Однако перемены, происшедшие во всех сторонах народной жизни, впечатляют. Многократный рост населения сопровождался интенсивным расширением пределов города. Естественно, это повлекло за собой рождение новых улиц, общее число каковых уже перевалило за 150.

Досадно, что при вдумчивом ознакомлении с современным перечнем улиц нельзя отрешиться от мысли, что столь серьезному вопросу у нас не уделялось должного внимания: скорее, поступали просто по наитию, а поэтому названия множества улиц не блещут оригинальностью и вряд ли могут претендовать на «сохранность» в веках.

*А. Мартынов*

**Мартынаў, А. Вуліца, якая носіць імя У. І. Леніна / А. Мартынаў // Камуністычная праца. – 1970. – 4 красавіка.**

# ВУЛІЦА, ЯКАЯ НОСІЦЬ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

Наўрад ці знойдзецца ў нашай краіне горад, у якім адна з цэнтральных вуліц ці плошчаў не насіла б імя вялікага правадыра чалавецтва У. І. Леніна. Ёсць такая вуліца і плошча і ў нашым горадзе. Аб многіх падзеях мінулага і буйных пераменах ў жыцці Кобрына раскажа знаёмства з імі.




Кабрынчане больш сталага ўзросту добра памятаюць горад у 1939 годзе, вуліцу Садовую, якая зараз носіць імя Пушкіна. Тады, ды і яшчэ гадоў 15 таму назад, на месцы цяперашняй плошчы стаялі крытыя саломаю хацінкі. Па другі бок - першая ў гісторыі Кобрына невялічкая аўтобусная станцыя, якая пры рэканструкцыі горада была знесена. А калі ўспомніць больш даўнія гады, то памяць падкажа, што ўсяго чвэрць стагоддзя назад адрэзку вуліцы паміж плошчамі Леніна і Свабоды наогул не існавала. У даваенны час, калі адзіным транспартам у гарадзе былі аднаконныя падводы, круты паварот з плошчы Свабоды на вуліцу Савецкую не перашкаджаў. У пасляваенныя гады, калі гарадскія вуліцы запрудзіў аўтатранспарт, трэба было прымаць меры па забеспячэнню бяспекі руху. Прапаноўваліся розныя варыянты. Згодна з адным з іх паміж вуліцамі Савецкай і Пушкіна пралёг пачатак цяперашняй вуліцы імя Леніна. Да гэтага ж часу адносіцца і ўзнікненне плошчы, якая таксама носіць імя правадыра.

На вуліцы імя Леніна ў пасляваенныя гады на былых пустэчах і агародах выраслі новыя, двухпавярховыя дамы. На нашых вачах быў знесен стары драўляны дом, што знаходзіўся паміж гэтымі новымі дамамі і ўнівермагам. Гэты будынак, так званая «папоўка», - апошні сведка мінулага комплекса, які ўзнік каля старажытнай Петрапаўлаўскай царквы, якая існавала «В Кобрини на городи» яшчэ ў 1465 годзе. Гэтая драўляная царква ў 1911 годзе была перанесена на старыя могілкі ў канцы вуліцы Першамайскай, а на яе месцы планавалася пабудаваць цагляную Петрапаўлаўскую-Сувораўскую. Першая сусветная вайна перашкодзіла ажыццяў-ленню гэтага плана. А нарыхтаваную для будаўніцтва цэглу ўкраў памешчык Банькоўскі на ўзвядзенне ў вёсцы Андронава жывёлагадоўчых памяшканняў. На месцы былога цвінтару зараз сквер імя Героя Савецкага Саюза А. І. Марозава.

З першых дзён узнікнення горада Рыначная плошча, да ўзнікнення плошчы імя Леніна з'яўлялася гістарычным цэнтрам горада. Яна была сведкай важнейшых падзей. На ёй закончыўся жорсткі бой у 1812 годзе, тут адбываліся мітынгі і дэманстрацыі салдат, прызваных у армию ў 1905 годзе. Адсюль выйшла першая першамайская дэманстрацыя рэвалюцыйнай моладзі Кобрына ў 1925 годзе. Тут была праведзена ў 1931 годзе дэманстрацыя беспрацоўных пад лозунгам «Хлеба і работы». А у 1939 г. тут з кветкамі ў руках сустракалі савецкіх воінаў, прынёсшых свабоду.

Некалькі двухпавярховых дамоў з вузкімі трохаконнымііі фасадамі пераносяць нас у яшчэ больш аддаленае мінулае, калі згодна з Магдэбургскім правам, якое атрымаў горад у 1589 годзе, дамы ў цэнтральнай частцы горада маглі быць строга абмежаваных размераў, расці ўверх, а не ў шырыню.

Побач з корпусам швейнай фабрыкі стаіць рад рознастыльных дамоў, у якіх зараз размешчаны магазіны. Гэта - былыя гандлёвыя рады, пабудаваныя ў двадцатых гадах на месцы драўляных, згарэўшых у 1915 годзе.

На старым плане Кобрына добра бачны два ўзгоркі, размешчаныя па абодвух баках вуліцы Леніна пры пад'ёме на мост праз раку Мухавец. Некалі гэтыя ўзгоркі называліся «Замкавымі гарамі». Злева знаходзіўся верхні замак, абнесены каменнымі сценамі, справа - ніжні, акружаны насыпамі з драўлянымі палісадамі. Разваліны замкаў былі знесены ў канцы XVIII стагоддзя. Апошнія сляды замкавай гары зніклі ў саракавых гадах мінулага стагоддзя, калі зямля з яе была ўзята на будаўніцтва насыпу шашы.

У 1864 годзе на брацкай магіле рускіх воінаў, якія загінулі ў баі 15 ліпеня 1812 года, быў пабудаваны каменны праваслаўны сабор. Зараз у ім размяшчаецца архіў. У непасрэднай блізкасці ад будынка - манументальны помнік у азнаменаванне першай перамогі над войскамі Напалеона.

Мост, праз які сёння праходзяць тысячы машын, пабудаваны пасля вайны. Яго драўляныя папярэднікі згарэлі ў час ваенных дзеянняў у 1915, 1939 і 1944 гадах.

За ракой вуліцу Леніна перасякае чыгунка, якая пралягла па глухой ускраіне ў васьмідзесятых гадах мінулага стагоддзя.

У даваенныя гады за чыгункай уздоўж вуліцы было не больш 10-15 невялічкіх домікаў, гаспадары якіх займаліся апрацоўкай зямлі. Зараз з абодвух бакоў яе выраслі новыя жылыя кварталы, з новымі дамамі, вуліцамі, сваёй школай, дзіцячым садам, добраўпарадкаванымі магазінамі, сталовымі, швейным атэлье камбіната бытавога абслугоўвання.

*А. МАРТЫНАЎ,*
*дырэктар музея імя А. В. Суворава.*
*1970 г.*

**Мартынаў, А. Галоўная плошча : з гісторыі горада / А. Мартынаў // Камуністычная праца. – 1972. – 24 ліпеня.**

# ГАЛОЎНАЯ ПЛОШЧА

На працягу многіх стагоддзяў гістарычна склаўшымся цэнтрам г. Кобрына была плошча Свабоды, якая раней называлася Рыначнай ці Базарнай. Даставерных сведак аб часу ўзнікнення нашай галоўнай плошчы не захавалася. Можна меркаваць, што яна ўзнікла яшчэ ў глыбокай старажытнасці, калі ў непасрэднай блізкасці на поўнач ад яе на востраве з'явіліся замкавыя ўмацаванні, пад аховай якіх паступова стаў забудоўвацца рамесленны і гандлёвы пасад. На шматвяковае існаванне плошчы ўказваюць таксама рэшткі старынных драўляных маставых, што сустракаюцца цяпер на вялікай глыбіні ў розных месцах.

З даўніх часоў Рыначная плошча была цэнтрам палітычнага і дзелавога жыцця горада. Тут адбываліся публічныя экзекуцыі і пакаранні смерцю, склікалася

агульнагарадское веча, на якім насельніцтва бурна абмяркоўвала найбольш актуальныя пытанні. Плошча служыла таксама месцам ярмарак, якія праходзілі тут кожны год 6 студзеня і 8 верасня пачынаючы з 1589 года да 1939 года. Сюды з'язджаліся сяляне, гандляры і памешчыкі не толькі з абшырнага Кобрынскага павету, але і з аддаленых мясцовасцей.

У першай палавіне XIX стагоддзя ў цэнтры плошчы былі пабудаваны аднапавярховыя гандлёвыя рады. Яны згарэлі ў жніўні 1915 года, у час Першай сусветнай вайны. У сярэдзіне 20-х гадоў кобрынскія купцы пабудавалі на гэтым месцы новыя гандлёвыя рады, частка якіх у змененым выглядзе захавалася і да гэтага часу. Будаўніцтва вялося на кааператыўных пачатках; кожны гандляр уносіў адпаведна з размерамі будучай лаўкі. Лаўкі ж гэтыя былі малыя - дзверы і вакно. Усяго іх налічвалася тут 150. Дарэчы, у Кобрыне да 1939 года было больш 500 самых разнастайных гандлёвых кропак.

Ніжнія паверхі ўсіх дамоў, якія размешчаны па перыметру плошчы. таксама былі заняты магазінамі, майстэрнямі, гасцінніцамі. Да 1939 года ў Кобрыне налічвалася 7-8 маленькіх гасцініц і заезджых двароў. На плошчы былі і цырульні, і майстэрні па рамонту гадзіннікаў, тут знаходзіўся і адзіны на ўвесь горад кіёск па продажу газет.

Па даўняй традыцыі да чэрвеня 1941 года ля гандлёвых радоў размяшчалася і біржа рамізнікаў, месца стаянкі іх пралётак.

Здымкі тых гадоў даюць нагляднае ўяўленне аб тым, якім быў знешні выгляд плошчы ў пачатку века. Над выстраенымі ў рад сялянскімі падводамі тарчаць аглоблі. Для забеспячэння вадой на вуглах плошчы былі два вялікія калодзежы пад гонтавымі дахамі. Ні аб якім азеляненні цэнтра горада ў дарэвалюцыйным Кобрыне ніхто і не думаў. У летні час тут панавала ўдушлівая спёка, слупы пылу. На працягу цэлай зімы з плошчы ніхто не прыбіраў залежаў конскага гною.

Бясконцыя войны і пажары на працягу стагоддзяў знішчалі пабудовы нашага драўлянага горада. Адзін з пажараў, які узнік у час бою 15 ліпеня 1812 года, знішчыў 550 дамоў з агульнай колькасці 630. Гэтым тлумачыцца адносная беднасць Кобрына помнікамі архітэктуры.

Адзін з нямногіх старых дамоў на плошчы Свабоды, абазначаны на плане горада канца XVIII стагоддзя, заняты цяпер аптэкай № 17. Крыху ўступаюць яму па ўзросту два суседнія - будынак кінатэатра «Спадарожнік» і дзіцячай бальніцы. Аднак пасля вайны своеасаблівыя фасады гэтых дамоў былі моцна зменены надбудаванымі псеўдамадэрнымі франтонамі.

Аб кобрынскім сярэдневякоўі напамінаюць тры дамы на рагу вуліцы Савецкай. Вузкія трохваконныя фасады іх характэрны для цэнтральнай часткі гарадоў, якія карысталіся так званым магдэбургскім правам, гарадскім самакіраваннем, якое было дадзена нашаму гораду ў 1589 годзе.

У мінулым наша плошча была сведкай многіх бурных падзей, якія патрасалі горад. Так, у 1706 годзе тут збіраліся гараджане, каб вырашыць пытанне аб уплаце цяжкай кантрыбуцыі, накладзенай войскам шведскага караля Карла XII.

У самы разгар бою, у ліпені 1812 года, напалеонаўскія войскі размясцілі на гэтай плошчы сваю артылерыю і вялі прамой наводкай агонь па рускіх салдатах, якія акружалі французаў кальцом. Магчыма, у час гэтага бою аказалася ссечанай кулямі адна са сцен старажытнай Петрапаўлаўскай царквы, што стаяла з XV века на паўднёвай ускраіне плошчы, пératворанай затым у сквер імя Марозава.

Змянілася аблічча плошчы ў саракавых гадах мінулага стагоддзя. Па заходнім баку яе пралягла шаша, у межах горада названая вуліцамі Бабруйскай і Брэсцкай, цяпер - імя Леніна і Савецкая. У разгар рэвалюцыйных падзей 1905 года на плошчы праходзілі бурныя масавыя мітынгі і дэманстрацыі, бунтавалі салдаты, якіх адпраўлялі на Далёкі Усход. Тут 1 мая 1925 года ўпершыню ўзвіўся над натоўпам чырвоны сцяг і калона рэвалюцыйнай моладзі накіравалася да турмы, у якой таміліся таварышы, кінутыя за краты польскай дэфензывай пасля «прафілактычных» перадсвяточных арыштаў.

Цяжка паверыць цяпер, што гэты добраўпарадкаваны куток горада вырас за пасляваенныя гады на захламленым пустыры. Незвычайнае ажыўленне пануе ў нашы дні на старажытнай плошчы – сапраўдным сэрцы Кобрына.

*А. МАРТЫНАЎ,*
*дырэктар музея імя А. В. Суворава.*
*1972 г.*

**Мартынов, А. «Мещанская улица» : старонкі гісторыі / А. Мартынов // Кобрынскі веснік. – 1993. – 17, 21 красавіка.**

# «МЕЩАНСКАЯ УЛИЦА»

В одной из своих предыдущих статей, припоминающей о старейших кобринских улицах, фигурировала одна, название которой в течение более четырех столетий по начальственной прихоти менялось семикратно. Ныне это окраинная Красноармейская ул., которую еще в довоенную пору городские старожилы упорно называли одним из прежних наименований «Гарбарская» (кожевенная). Это сказывалось в повседневном выражении «сходить на Гарбары».

То, что здесь излагается о быте и нравах одной улицы, в основном характерно и для остальных трех «мещанских» улиц: Октябрьской, Пролетарской и Никольской.

Согласно древнему документу 1563 г., когда улица еще носила первозданное имя «Болотская» поскольку пролегла в направлении дер. Болота, ее «первая полать по-леве» состояла из четырнадцати домовладений тогда как «другая полать по-праве» насчитывала семнадцать таковых. Нам неизвестно, когда и по какой причине прямолинейная уравниловка наделила всех застройщиков идеально равными участками по три «селибных» и два огородных прутов (*прут – мера длины 4,7 м.*), за которые взимала налог в сумме 5 пенязей за селибный прут и 2 1/2 - за огородный. Ни одно из приведенных в перечне 31 названий мещан (фамилии в нашем понятии в то время у простолюдинов вообще не было) поныне не сохранилось. Впрочем, чтобы ощутить дух эпохи, приведем несколько наиболее характерных: Ивашко Хомич, Римчич, Сенько Пышкевич, Хведко Чинкевич, Тец Хведцевич и др.

В незапамятные времена улица отпочковалась от старинного Пинского тракта непосредственно за земельным участком «школы жидовской» (еврейской синагоги). Еще в двадцатых годах здесь пролегал узкий извилистый переулок, переходивший в

нынешнюю ул. Кирова, возникновение которой относится к относительно недавнему периоду. Попутно следует припомнить, что еще в довоенные годы Красноармейская улица, соединялась с Октябрьской узкой проселочной дорогой, которая упиралась в деревянный пешеходный мостик через Кобринку, зачастую сносимый половодьем. Продолжая перечень позднейших ответвлений от нашей «магистрали», следует назвать небольшой переулок, соединяющий Красноармейскую с Первомайской улицей. Ныне он носит имя партизана Т. Кравчука. Еще до 1939 г. этот переулок был собственностью соседнего костела, символом чего служили дощатые ворота с калиткой в его начале.

Шествуя далее к востоку, вскоре достигаем ул. Горького, полностью отсутствующей на довоенном плане города. Здесь пролегала полевая дорога, справа от которой вразброс стояли несколько мещанских домиков, выстроенных на огородных участках, называемых «Загрудками». Слева от дороги простирался обширный городской выгон, служивший для выпаса мещанского скота. С южной стороны его возвышался земляной вал, предназначенный на тир для обучения боевым стрельбам городской полиции. После крутого изгиба наша улица пересекается густо застроенной Красногвардейской ул., отрезок которой до Первомайской возник в 30-х гг. Ранее здесь проходила частная дорога через костельные владения, которая также закрывалась воротами. Возведение этой дороги в ранг Костельного переулка, расширение и частичная застройка относится к началу 40-х гг.

Испокон веков коренное мещанство занималось земледелием, причем устоявшийся уклад жизни почти не отличался от крестьянского. Главным различием было лишь то, что на основании городского самоуправления, «магдебургского права», полученного Кобрином в 1589 г., мещане обладали личной свободой от «панщизны» и рядом иных привилегий. Лишь в обозримом прошлом былая однородность сменилась «трехслойной». Помимо землеробов появились служилые люди, а также одиночные ремесленники и торговцы евреи. В языковом отношении преобладал местный деревенский говор - «казаты по просту». Затем следовали русский, польский и еврейский языки. Верующие разделялись на православных, католиков и иудеев. Впрочем, различие языков и верований нисколько не сказывалось на традиционном добрососедстве, отношении друг к другу с завидной терпимостью. Главным похвальным определением было - соседский человек. А уж затем применялись общечеловеческие ценности: хороший - плохой, разумный - дурень, работяга - гультай, заможный - голота.

Дома обычно строились низкими, с небольшими окнами о шести стеклах, поэтому в комнатах обычно господствовал полумрак. Обычно непосредственным продолжением жилого дома служило помещение для хранения зерна, далее шел коровник, конюшня, свинарник. Даже если скотские сараи не примыкали непосредственно к жилью, строились они поблизости от такового. Тогда как клуня, предназначенная под необмолоченный хлеб и фураж, возводилась обязательно поодаль. Делалось это из разумной предосторожности на случай пожара, которым при скученности деревянно-соломенной застройки нередко истреблялись целые улицы.

Естественно, что семейными разделами первоначальные земельные наделы непрерывно дробились, в результате чего лишь у немногих мещан земельные угодья достигали 5-10 десятин. Притом отдельные клочки земли были разбросаны по отдаленным урочищам, нередко за Мухавцем. Можно себе представить, сколько времени требовалось, чтобы на тщедушной лошаденке весной свезти на поле фуру навоза, а затем доставить на усадьбу урожай. По традиции выпасы для скота были общими для

всех землевладельцев. Интересно, что названия земельных угодий сохранились с отдалённого средневековья: волоки, морги, пруды, наддавки, реже употреблялись официальные десятины.

Примитивные методы земледелия, унаследованные от деда-прадеда, приносили ничтожные урожаи, которых едва хватало для собственных потребностей. Лишь в тридцатые годы началось робкое применение искусственных удобрений, да и то недоступных для большинства малоземельных вследствие дороговизны. Не приходится удивляться при таких обстоятельствах, что даже в предвоенные годы, по официальным данным, средний урожай зерновых с га колебался от 6 до 10 цент., а картофеля – до 150 цент.

Лошади имелись далеко не в каждом подворье. Зато одна, а то и две коровы с приплодом и «кормник» - кабанчик держались в самом захудалом хозяйстве. Впрочем, низкопородные коровы давали низкие удои, держались также для навоза, да и убойный вес «кормника» редко переваливал за центнер. Тем не менее, следовать агрономическим советам, а тем более применять рациональные новшества в большинстве избегали, либо делали с робкой оглядкой. Излюбленными орудиями труда служили извечные плуг да борона, причем последняя применялась и деревянная, патриархальные серп да коса вкупе с деревянными вилами-тройчаткой. Посев велся вручную из плетеного короба, молотили на глиняном току прадедовскими деревянными цепами. В каждом втором доме имелись ручные жернова для помола зерна и деревянная ступа.

В случае возникшей необходимости быстро осуществить трудоемкое мероприятие - выкопать колодец, перекрыть крышу – соседи созывались на «толоку», безвозмездную помощь, символическим вознаграждением за которую было щедрое угощение. Среди женщин широким распространением пользовались взаимные обмены трудоднями на жатве и уборке картофеля, называемые «отжинками» и «откопинами». Вообще в уборочную страду мещанкам доставалось не меньше, чем их сельским подругам. Не от хорошей жизни пожилая женщина, мать многодетной семьи, будучи не в состоянии сгибаться, жала на коленях. И еще один забавный штришок: работающие на солнцепеке девушки тщательно завязывали лицо платком, ибо мода того времени предосудительно воспринимала загар.

Свято следуя дедовскому завету «успеется», обмолот собранного хлеба во многих хозяйствах затягивался нередко до весны.

Еще до эвакуации 1915 г. во многих мещанских семьях в зимние вечера женщины пряли на самопрялках куделю из собственного льна, весной же ткали на домашних станках - «кроснах» холсты и суконную ткань. Как положено, холсты белились на росе, после чего из полотна шилось белье для всей семьи. Повсюду хлеб из домашней муки выпекался дома. А в небольших семьях, во избежание чрезмерного зачерствения, было в обычае обмениваться свежим караваем с соседями. К этому следует добавить трудности с топливом – дорогостоящими дровами. Поэтому в некоторых домах, располагавших излишками соломы, печи отапливались соломенными жгутами.

Такова была в общих чертах достаточно безрадостная картина мещанского бытия вплоть до Первой мировой войны. Впрочем, эти краткие заметки были бы далеко не полными без упоминания о чувстве собственного достоинства и даже своеобразной горделивости, присущей представителям некоторых мещанских «династий», со значением подчеркивающих принадлежность к своему сословию – «всячески мещаны». Это говорилось в противовес «наволочи», все чаще вкрапливающейся в мещанскую

среду в пределах одного-двух последних поколений. Прежде всего имелось в виду потомство нескольких «николаевских солдат», за пятнадцатилетнюю службу награждаемых земельными участками в полдесятины.

«Именитых фамилий, присущих по преимуществу описываемой улице, было немного: Рафаловичи, Сацевичи, Игнатовичи, Маслеевичи, Яроцевичи, Качанко. Любопытно, что в начале нынешнего столетия на этой улице в тесном соседстве проживали все руководители города. Так, до 1911 г. городским головой нескольких сроков выбирался Николай Осипович Яроцевич. После его смерти этот пост занимал его заместитель и ближайший сосед Пётр Иванович Рафалович, отдалённый предок которого в 1812 г. был также «президентом» городского самоуправления. Вплоть до эвакуации в 1915 г. бразды правления городскими делами разделялись им с заместителем Яковом Ивановичем Качанко, жившим поблизости на этой же улице.

**Мартынов, А. М. Прогулка по Первомайской улице [Электронный ресурс] / А. М. Мартынов // Мой Кобрин. – Режим доступа: http://ikobrin.ru/martinov-13.php. – Дата доступа: 07.07.2017.**

# ПРОГУЛКА ПО ПЕРВОМАЙСКОЙ УЛИЦЕ

В отличие от других кобринских улиц, наименования которых менялись неоднократно, Первомайская в течение столетий была Пинской, сравнительно непродолжительное время (при польской администрации) она была улицей 8 Мая и лишь с 1939 года получила свое нынешнее название.

Что касается письменного упоминания, то оно впервые встречается в середине XVI столетия, когда королева Бона, владевшая в ту пору Кобрином, велела выделить участок под застройку на Пинской улице своему придворному ювелиру «неаполитанчику» (жителю Неаполя).

Более обстоятельные данные встречаем в «Ревизии Кобринской экономии» 1563 года. Из этого документа мы узнаем, что на нашей улице имелось 78 строительных участков, из них 25 принадлежащих плебании (католическому духовенству). Здесь же упомянут дом игумена православного монастыря. По-видимому, эта улица являлась центром немногочисленной в то время еврейской колонии, которой принадлежало 18 домовладений.

В пятидесятых годах XX столетия в связи с земляными работами улица была перекопана в самом начале. При этом на глубине двух метров обнаружились остатки древней бревенчатой мостовой. Любознательные землекопы попутно установили, что под верхним слоем бревен имелись дальнейшие (припомним попутно, что в Новгороде обнаружено до двадцати наслоений подобных мостовых). Приходится лишь сожалеть, что целенаправленные раскопки в Кобрине никогда не проводились.

Что касается частых в давние времена пожаров, то Пинская улица не являлась исключением и полностью выгорела в 1812 году. Последний памятный опустошительный пожар возник летом 1905 года в связи с волнениями среди запасных солдат, отправляемых в Маньчжурию. О масштабах пожара и понесенном ущербе

свидетельствует официальное обращение о помощи погорельцам Пинской улицы, напечатанное в одном из популярнейших журналов «Ниве».

Итак, после необходимого исторического введения отправимся в путь, обращая внимание на места и дома, связанные с какими-то людьми или событиями.

При взгляде на дом № 3 припоминается, что в нем до 1939 года располагался магазин тканей, принадлежавший Санину, который учился в Берлинском университете. В 1941 году один из немецких военных комендантов, учившийся вместе с Саниным, завербовал его переводчиком. Использовав представленную возможность, при разборке советских документов Санин стал уничтожать бумаги, компрометирующие многих сограждан. Схваченный с поличным, он был немедленно расстрелян.

Дом бывшей связи принадлежал до 1915 года воинскому присутствию (военкомату). А в следующем за ним доме во дворе была казарма конвойной команды, в задачи которой входила охрана тюрьмы и конвоирование арестованных в Гродненскую губернскую тюрьму.

Телеграфный столб напротив этого дома связан с событиями недавней истории. Осеню 1943 года подпольщик Тадеуш Горбатовский, входивший в диверсионную антифашистскую группу, пытался при помощи магнитной мины взорвать этот важный для немецкой связи столб, укрепленный на двух рельсах. Хотя один рельс был перебит взрывом, столб оказался невредимым на втором рельсе. Вскоре подпольщики были выданы провокатором, и в канун 1944 года Горбатовский с товарищами были повешены.

Продолжим наш поход. Припомним, что вплоть до 60-х годов мост через Кобринку был деревянным и многократно сгорал, а в то время памятного половодья весной 1958 года, когда поверхность его в течение недели стояла под водой, чуть вообще не был снесен разгулявшейся стихией.

В трех смежных домах возле Кобринки (11-12-13) до 1939 года прозябали три маленькие гостиницы. После войны в одном из них (№ 15) размещался кобринский горисполком. В 1942 году деревянный дом (№ 11) занимала гитлеровская офицерия. Заложенная рукой партизана в отверстие фундамента взрывчатка разворотила фасад дома и навела панику среди фашистов, среди которых было немало жертв.

Нынешний кинотеатр «17 Сентября» ранее назывался по фамилии владельца «кино Эбрама». В августе 1944 года в этом здании происходило фронтовое совещание с участием маршала К.К. Рокоссовского.

А вот несколько наискосок через улицу (№ 30) в годы оккупации был полицейский участок, поврежденный партизанской миной, подложенной связанным с местными партизанами полицейским.

У наших взыскательных современников может вызвать недоумение, что в довольно-таки непрезентабельном деревянном доме до 1939 года был самый «фешенебельный» в городе ресторан пани Карпинской.

С одним из самых трагических событий истории Кобрина связан одноэтажный дом (№ 32), первоначально служивший еврейской больницей. В 1941-1942 гг. этот дом занимало центральное административное управление еврейского гетто, так называемый «юденрат».

Полагаю, что у сотрудников кожно-венерического диспансера вызовет удивление сообщение о том, что вплоть до 1939 года этот дом принадлежал клубу помещиков «Одродзенье». Здесь давались балы с обильным возлиянием.

Следующим объектом нашего обзора следует назвать строение бывшей еврейской синагоги, выстроенной в первой половине XIX столетия на окраине тогдашней Пинской улицы.

Ну а в невзрачном деревянном домике (№ 67) в свое время была кустарная мастерская по изготовлению папиросных гильз, официально именуемая «фабрикой гильз» с 6-8 работницами.

Подслеповатый домишко (№ 71), доживающий последние месяцы своего существования, связан с судьбой подпольной активистки КПЗБ Кати Гасилевич. В белопольский период она была узницей концлагеря Картуз-Береза. В предвоенное время возглавляла соседний детдом и была расстреляна гитлеровцами у стен нынешней милиции в первые дни войны.

В доме № 85 до 1939 года обосновались католические монахи, организовавшие для местных сирот детдом, служивший целям ополячивания ребят. Здесь же была столярная мастерская, в которой учился будущий Герой Советского Союза В. Н. Кирманович.

На месте нынешней спортплощадки СШ № 2 ранее находилось старинное еврейское кладбище, давно упраздненное. В годы фашистской оккупации в школе размещался эскадрон конной жандармерии, предназначенной для борьбы с партизанами. А на заброшенном кладбище были выстроены большие конюшни. Местный земледелец Алексей Никонович Куреша, партизанский связной, подрядился вывозить навоз из конюшен, причем отравил свыше 70 лошадей, после чего ушел в партизанский отряд им. Чапаева.

Сквер на противоположной стороне улицы возник в послевоенные годы. До войны же здесь была торговая площадь, предназначенная для продажи дров, сена, соломы, стройлеса.

А в одном из домов на углу сквера (№ 60) до 1939 года жили католические монахини уршулянки, организовавшие детсад для воспитания малышей в клерикально-националистическом духе.

В пятидесятые годы на месте бывшего торжища заложен сквер, которому присвоено имя командира 22-й танковой дивизии генерал-майора В. П. Пуганова, погибшего в бою под Кобрином 23 июня 1941 года. Здесь же он захоронен. Рядом находится могила Героя Советского Союза А. И. Морозова, погибшего в бою за освобождение Кобрина в июле 1944 года. В центре сквера на братской могиле советских воинов, освобождавших наш город, сооружен памятник с фигурой воина. На мраморных плитах перечислены имена погибших.

Здание СШ № 2 строилось в течение ряда лет и осваивалось с 1936 года. Мемориальная доска напоминает об ученике школы – Герое Советского Союза В. Н. Кирмановиче.

В сороковые годы XIX столетия на пустыре в конце улицы построен католический костел, ставший оплотом клерикализма и шовинизма в 1920-1939 гг. В здание костела и кирпичной стены вложен труд сотен угнетенных бесправием крепостных крестьян.

На противоположной стороне улицы в скромном деревянном доме под № 103, где теперь детсад № 3, до 1910 года размещалось мужское приходское училище, впоследствии перемещенное в одно из зданий школьного комплекса при СШ № 2.

На углу Красногвардейской улицы, где теперь мастерские строительной организации, в 1944 году размещался лагерь военнопленных итальянцев.

Более интересная история у длинного дома (№ 109), расположенного напротив Красногвардейской улицы. Первоначально строение занимала так называемая богадельня. В сентябре 1939 года здесь обосновалась казарма Красной гвардии, созданной для поддержания порядка и охраны общественного имущества в смутный переходной период и вплоть до появления регулярной милиции.

На давно закрытое городское кладбище в 1912 году была перенесена из центра города древняя Петропавловская церковь, существовавшая «в Кобрыни на городи» уже с середины XVI века. На ее прежнем месте в центре города впоследствии выстроен Дом культуры.

В самом конце прежней Пинской улицы, где ныне раскинулись ряды гаражей, до 1939 года в каждые 10-20-30 числа каждого месяца разворачивалась обширная скотская ярмарка, на которую съезжались скототорговцы из Варшавы и других отдаленных мест. Велась торговля волами, коровами, лошадьми и особенно свиньями.

А на участке, ныне занимаемом гортопом, до 1915 года высились огромные воинские продовольственные склады. Напоминание о них сохранилось в виде уцелевшей кирпичной караульной будки.

На противоположной стороне шоссе еще в середине 20-х гг. имелась песчаная возвышенность, на которой маячила ветряная мельница.

В заключение нашей затянувшейся прогулки следует припомнить, что шоссе, связывающее Кобрин с Пинском (128 километров), строилось без малого 15 лет. Ну а Днепро-Бугский канал слил свои воды с Мухавцем в этих местах только в 1940 году.

*08.05.1988 г*

**Пліско, Н. Гарадскія вуліцы расказваюць / Н. Пліско // Камуністычная праца. – 1982. – 9 лютага.**

# ГАРАДСКІЯ ВУЛІЦЫ РАСКАЗВАЮЦЬ

Адна з найбольш характэрных прымет нашага часу - узрастаючая актыўнасць народа ў грамадскім жыцці, а таксама жаданне лепш ведаць гісторыю. Было б памылковым сцвярджаць, што кабрынчане раней не цікавіліся мінулым свайго горада. Да таго ж раённая газета рэгулярна друкавала артыкулы на гістарычныя і краязнаўчыя тэмы, якія пісалі старажылы, удзельнікі падзей, краязнаўцы, работнікі музея імя Суворава, архіва.

Разам з тым прыходзіцца пераконвацца, што многія жыхары Кобрына вельмі слаба арыентуюцца ў асноўных гістарычных этапах сямісотгадовага горада. Прычын шмат.

Адна з іх, мне здаецца, у тым, што сам горад мала расказвае і напамінае аб мінулых стагоддзях і падзеях. Я маю на ўвазе тую абставіну, што ў горадзе мала помнікаў архітэктуры, якія былі разбураны ў выніку шматлікіх войнаў, што праімчаліся за сем стагоддзяў. Асабліва разбуральнымі былі падзеі 1812 года, першай сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў. Да гэтых разбурэнняў далучаліся страты з-за пажараў.

Але і мы, жыхары горада, таксаіма вінаватыя ў тым, што з аблічча Кобрына

сціралася гістарычная памяць.

Дастаткова паглядзець на трохпавярховы цэх швейнай фабрыкі, каб пераканацца ў праваце гэтых слоў. 25 гадоў назад ні тагачасны дырэктар фабрыкі, ні кіраўнікі горада не пажадалі прыслухацца да думкі гісторыкаў, краязнаўцаў і валявым распараджэннем пабудавалі гэты цэх на старой рыначнай плошчы, дзе з даўніх часоў размяшчаліся гандлёвыя рады. Горад страціў складаўшуюся за стагоддзі індывідуальнасць. А фабрыка праз больш як 20 гадоў зноў мае тую ж праблему. А калі б у пачатку шасцідзесятых гадоў перайшла на новую тэрыторыю, было б сёння месца для далейшага расшырэння, а Кобрын захаваў бы сваё непаўторнае аблічча.

Гістарычная памяць знікала і таму, што знікалі старыя назвы вуліц. У розныя гады іх мянялі на новыя, больш сугучныя сацыялістычным пераўтварэнням, што адбываліся на Кобрыншчыне. У адносінах некаторых вуліц гэта было апраўдана, а іншыя варта было б захаваць. Лічу, што цяпер мы маем падставы для таго, каб вярнуць вуліцам старыя назвы. І заклікаю ўсіх кабрынчан прыняць удзел у абмеркаванні гэтага пытання.

Так у «Рэвізіі Кобрынскай эканоміі», якая праводзілаіся ў 1563 годзе, цяперашняя Першамайская насіла назву Пінскай. Прапаную зноў назваць яе Пінскай.

Вуліца Савецкая называлася Брэсцкай, Інтэрнацыянальная - Ратненскай. Апошняя ў пачатку стагоддзя была Славянскай, а з 1939 года па чэрвень 1941 - імя Перэца (па прозвішчу яўрэйскага пісьменніка). Вуліца Пралетарская была Ганчарнай.

Гэтыя старыя назвы трэба вярнуць пералічаным вуліцам, а выдатныя назвы - Савецкая, Першамайская, Пралетарская, Інтэрнацыянальная - выкарыстаць для найменавання іншых вуліц, якія сёння называюцца: Вуглавая, Кароткая, Крайняя...

Хачу таксама напомніць, што ў кнізе «Рэвізія Кобрынскай эканоміі» вуліца Камуністычная абазначана як Астрамецкая. У той час прамой дарогі на Мінск, састаўной часткай якой сёння з'яўляецца вул. Леніна, не было. Пераправа праз Мухавец ажыццяўлялася прыблізна ў канцы вуліцы «17 Верасня». Высокага насыпу для цяперашняга моста таксама не было, а пераправіўшыся праз Мухавец, адразу ж паварочвалі направа і па Астрамецкай, уздоўж Мухаўца ехалі на Астромічы і далей на Бабруйск. Па-гэтаму, калі ў 40-х гадах XIX стагоддзя праз горад пралягла Маскоўска-Варшаўская шаша, то і вуліцу, што вяла ад рыначнай плошчы за мост, назвалі Бабруйскай. Сёння, безумоўна, няма сэнсу мяняць назву вуліцы Леніна, бо вядзе яна не на Бабруйск. Ды і Камуністычная не з'яўляецца дарогай на Астромічы.

Адна са старажытных вуліц горада - Акцябрская. У розны час яна насіла назвы Балотная, Агародніцкая, Мяшчанская. Ні адна з іх не адпавядае сённяшнім умовам жыцця.

Асобна хочацца пагаварыць аб Сувораўскай вуліцы. Яе праклалі ў 1768 годзе, калі ў кіламетры ад горада паявіўся маёнтак «Губерня». Адсюль і яе першая назва - Губерніяльная. Так яна называлася да канца 50-х гадоў XIX стагоддзя. У пачатку 60-х гадоў у памяць аб знаходжанні ў Кобрыне вялікага рускага палкаводца, які жыў на гэтай вуліцы, яна была названа яго іменем.

Як вядома, у 1921 годзе па Рыжскаму мірнаму дагавору тэрыторыя Заходняй Беларусі ўвайшла ў састаў памешчыцка-буржуазнай Польшчы. Неўзабаве вуліца Суворава была перайменавана ў вуліцу Траўгутаву і так яна называлася да верасня 1939 года. Потым ёй вярнулі імя Суворава. Але не надоўга. Калі ў чэрвені 1941 года горад захапілі фашысты, яе назвалі Ліндэнштрасе, г. з. Ліпавая алея. У ліпені 1944 года Кобрын быў вызвалены, і вуліца зноў пачала насіць імя вялікага палкаводца.

Нядаўна ў абласной газеце «Заря» жыхары г. Брэста А. Цвыд і В. Калеснік прапанавалі, каб у Кобрыне «... вуліцы вярнулі імя Рамуальда Траўгута, якое яна насіла да вайны».

Як бачна з гэтых слоў, аўтары не ведаюць гісторыі вуліцы, аднак дазваляюць сабе ўносіць пэўныя прапановы. Кабрынчане самі даўно вырашылі, якая назва вуліцы найбольш апраўдана гістарычна.

Зусім нядаўна ў раённай газеце быў апублікаваны выдатны нарыс нашага земляка А. Сушчука аб Р. Траўгуце. Мы не павінны забываць імёнаў людзей, якія склалі свае галовы за свабоду народа.

І каб захаваць памяць аб Р. Траўгуце, у Кобрыне трэба было б назваць адну з вуліц яго іменем. Якая гэта будзе вуліца - рашаць самім кабрынчанам.

У нашым горадзе не адзначана памяць многіх.

Васіль Іванавіч Чуйкоў, двойчы Герой Савецкага Саюза, Маршал СССР, удзельнік вызвалення Беларусі. У 1939 годзе з сакавіка па снежань ён камандаваў 4-й арміяй, штаб якой стаяў пасля вызвалення ў Кобрыне.

Не ўвекавечана ў нас памяць аб такіх палкаводцах, як Г. К. Жукаў, К. К. Ракасоўскі. Дарэчы, К. К. Ракасоўскі камандаваў 1-м Беларускім фронтам, войскі якога ў ліпені 1944 года вызвалялі Кобрын. Адразу ж пасля вызвалення, калі ішла падрыхтоўка да баёў за Брэст, на працягу некалькіх дзён у памяшканні кінатэатра «17 Верасня» па вуліцы Першамайскай, відавочна, размяшчаўся штаб фронта на чале з К. К. Ракасоўскім.

Няма ў нас вуліц імя А. С. Грыбаедава, К. Г. Паўстоўскага. Першы з іх, будучы карнетам Іркуцкага гусарскага палка, у 1813 годзе пражыў у Кобрыне некалькі месяцаў. А К. Г. Паўстоўскі жыў у нашым горадзе ў 1915 годзе і пазней у сваіх успамінах пісаў аб Кобрыне, што яго ўразіла мноства дахаў у цэнтры горада, крытых чырвонай чарапіцай.

Хочацца напомніць яшчэ пра аднаго паэта, нашага земляка, імя якога доўгі час было забытым. Дзмітрый Ніканоравіч Ляўчук (літаратурны псеўданім Фалькоўскі) нарадзіўся ў вёсцы В. Лепясы ў 1898 годзе. Адзін з арганізатараў партызанскага руху на Кобрыншчыне ў 1918 годзе, удзельнік барацьбы за ўстанаўленне Савецкай улады ў 1921 годзе на Каўказе, член КПЗБ і актыўны барацьбіт супраць памешчыцка-буржуазнага кіраўніцтва Польшчы ў Кобрынскім павеце з 1920 года. З 1925 года жыў на Украіне, пісаў вершы на украінскай мове. У 1934 годзе быў рэпрэсіраваны. Імя яго таксама павінна быць увекавечана ў назве якой-небудзь вуліцы ў Кобрыне.

Ёсць у нас у цэнтры горада вуліца, што носіць імя Жданава, які меў дачыненне да рэпрэсій і масавага знішчэння савецкіх людзей. Вуліцу трэба перайменаваць. Прапаную яе жыхарам зрабіць выбар з трох прозвішчаў: Р. Траўгута, В. І. Чуйкова і Д. Н. Фалькоўскага.

Ды і ўсім гараджанам варта падумаць і ўнесці свае прапановы па перайменаванню такіх вуліц і завулкаў, як Дальні, Дарожны, Другі, Першы. Кальцавы, Пясчаны, Рабочы, Пуцейскі, Вуглавы, Будаўнічы і г. д.

*Н. ПЛІСКО, дырэктар*
*Кобрынскага ваенна-гістарычнага*
*музея імя А. В. Суворава.*
*1982 г.*

# ФОТАГАЛЕРЭЯ

# ДАВАЕННЫХ ВУЛІЦ







ПІНСКАЯ ВУЛІЦА

МЯШЧАНСКАЯ ВУЛІЦА







БАБРУЙСКАЯ ВУЛІЦА




**СУВОРАЎСКАЯ ВУЛІЦА**







**ВУЛІЦА ПІЛСУДСКАГА**




**РЫНАЧНАЯ ПЛОШЧА**




**БРЭСЦКАЯ ВУЛІЦА**





**ГРОДЗЕНСКАЯ ВУЛІЦА**

**БАЗЫЛІЯНСКАЯ ВУЛІЦА**






**РАТНЕНСКАЯ ВУЛІЦА**


Kobryn. Victoriastraße.


Kobryń. Rynek


Kobryn.
94

# Я ІДУ ПА ГОРАДУ,
# ПА ЗНАЁМАЙ ВУЛІЦЫ

## *СУЧАСНЫЯ НАЗВЫ ВУЛІЦ ГОРАДА КОБРЫНА*

*З даваенных гадоў, калі колькасць гарадскіх вуліц ледзь перасягнула за два дзясяткі, прайшло больш сямідзесяці гадоў. Для шматвяковай гісторыі Кобрына не так ужо шмат. Аднак змены, якія адбыліся, уражваюць. Сёння горад Кобрын здзіўляе тых, хто прыязджае з іншых гарадоў і краін, а таксама захапляе тых, хто пражыў тут жыццё. Рост насельніцтва горада суправаджаўся інтэнсіўным пашырэннем межаў Кобрына. Безумоўна, гэта вабіла за сабой нараджэнне новых вуліц. Працягласць гарадской вулічнай сеткі сёння складае 190 км, з іх больш 60 км вуліцы з гравійным пакрыццём. За апошнія гады змяніліся вуліцы, плошчы горада; яны сталі больш шыкоўнымі і добраўпарадкаванымі, чым раней. Большасць вуліц горада мае выдатнае асфальтавае пакрыццё, на ўсіх цэнтральных вуліцах – дробнаштучная, каляровая тратуарная плітка. Кардынальна змяніліся нашы вуліцы. Частка вуліцы Мікалаева (у раёне гандлёвага цэнтра «Палессе») зроблена па ўсім еўрапейскім стандартам, з прымяненнем навейшых сучасных тэхналогій. Вуліца Дружбы зведала значныя перамены, стала адной з галоўных вуліц горада, сучасным праспектам. Плошча Леніна і размешчаная побач вуліца Суворава (сапраўдны кобрынскі «Арбат») аддадзены ва ўладу пешаходам і радуюць сваімі прыгожымі фігурнымі клумбамі, сімпатычнымі ліхтарамі і скамейкамі. Сёння вуліцы Дзяржынскага, 700-годдзя Кобрына – шырокія магістралі, паабапал якіх выраслі шматпавярховыя дамы, гандлёвыя цэнтры, аўтастаянкі, выкладзеныя пліткай пешаходныя дарожкі.*

*Сёння ў Кобрыне 3 плошчы, 80 завулкаў, 173 вуліцы. Пра шматлікія «вулічныя» імёны нават карэнныя гараджане не ведаюць. Прагуляйцеся па Кобрыну, і вы зробіце для сябе шмат адкрыццяў…*

*Запрашаем пазнаёміцца з перачнем сучасных вуліц Кобрына. Дарэчы, спіс назваў вуліц, плошчаў, завулкаў прадстаўлены на беларускай і рускай мовах у алфавітным парадку.*

## ПЛОШЧЫ Г. КОБРЫНА

| | |
|---|---|
| Плошча (пл.) Замкавая | Площадь (пл.) Замковая |
| Плошча (пл.) Леніна | Площадь (пл.) Ленина |
| Плошча (пл.) Свабоды | Площадь (пл.) Свободы |

# ЗАВУЛКІ Г. КОБРЫНА

| | |
|---|---|
| Завулак (зав.) **А**брыкосавы | Переулок (пер.) Абрикосовый |
| Завулак (зав.) Авіяцыйны | Переулок (пер.) Авиационный |
| Завулак (зав.) Агародны | Переулок (пер.) Огородный |
| Завулак (зав.) Азёрны | Переулок (пер.) Озёрный |
| Завулак (зав.) Астраўлянскі | Переулок (пер.) Островлянский |
| Завулак (зав.) **Б**рылёўскі | Переулок (пер.) Брилёвский |
| Завулак (зав.) Будаўнічы | Переулок (пер.) Строительный |
| Завулак (зав.) Бэзавы | Переулок (пер.) Сиреневый |
| Завулак (зав.) Бярозавы | Переулок (пер.) Берёзовый |
| Завулак (зав.) **В**акзальны | Переулок (пер.) Вокзальный |
| Завулак (зав.) Верасковы | Переулок (пер.) Вересковый |
| Завулак (зав.) Вінаградны | Переулок (пер.) Виноградный |
| Завулак (зав.) Вішневы | Переулок (пер.) Вишнёвый |
| Завулак (зав.) Вуглавы | Переулок (пер.) Угловой |
| Завулак (зав.) Высокі | Переулок (пер.) Высокий |
| Завулак (зав.) Вярбовы | Переулок (пер.) Вербовый |
| Завулак (зав.) Вясенні | Переулок (пер.) Весенний |
| Завулак (зав.) **Г**анчарны | Переулок (пер.) Гончарный |
| Завулак (зав.) Гарадскі | Переулок (пер.) Городской |
| Завулак (зав.) Гаражны | Переулок (пер.) Гаражный |
| Завулак (зав.) Грушавы | Переулок (пер.) Грушевый |
| Завулак (зав.) **Д**альні | Переулок (пер.) Дальний |
| Завулак (зав.) Дарожны | Переулок (пер.) Дорожный |
| Завулак (зав.) Дачны | Переулок (пер.) Дачный |
| Завулак (зав.) Дзівінскі | Переулок (пер.) Дивинский |
| Завулак (зав.) Добры | Переулок (пер.) Добрый |
| Завулак (зав.) Другі | Переулок (пер.) Второй |
| Завулак (зав.) Дружны | Переулок (пер.) Дружный |
| Завулак (зав.) **З**авадскі | Переулок (пер.) Заводской |
| Завулак (зав.) Зарэчны | Переулок (пер.) Заречный |
| Завулак (зав.) Заходні | Переулок (пер.) Заходний |
| Завулак (зав.) **К**алгасны | Переулок (пер.) Колхозный |
| Завулак (зав.) Кальцавы | Переулок (пер.) Кольцевой |
| Завулак (зав.) Кароткі | Переулок (пер.) Короткий |
| Завулак (зав.) Кветкавы | Переулок (пер.) Цветочный |
| Завулак (зав.) Кіжаватава | Переулок (пер.) Кижеватова |
| Завулак (зав.) Кляновы | Переулок (пер.) Кленовый |
| Завулак (зав.) Крайні | Переулок (пер.) Крайний |
| Завулак (зав.) Крынічны | Переулок (пер.) Криничный |
| Завулак (зав.) **Л**ётны | Переулок (пер.) Лётный |
| Завулак (зав.) Лугавы | Переулок (пер.) Луговой |
| Завулак (зав.) **М**агдалінскі | Переулок (пер.) Магдалинский |
| Завулак (зав.) Маладзёжны | Переулок (пер.) Молодёжный |
| Завулак (зав.) Малы | Переулок (пер.) Малый |

| | |
|---|---|
| Завулак (зав.) Мірны | Переулок (пер.) Мирный |
| Завулак (зав.) Міцкевіча | Переулок (пер.) Мицкевича |
| Завулак (зав.) Мухавецкі | Переулок (пер.) Мухавецкий |
| Завулак (зав.) **П**аліграфічны | Переулок (пер.) Полиграфический |
| Завулак (зав.) Першы | Переулок (пер.) Первый |
| Завулак (зав.) Прыбрэжны | Переулок (пер.) Прибрежный |
| Завулак (зав.) Пуцейскі | Переулок (пер.) Путейский |
| Завулак (зав.) Пясчаны | Переулок (пер.) Песчаный |
| Завулак (зав.) **Р**абінавы | Переулок (пер.) Рябиновый |
| Завулак (зав.) Рабочы | Переулок (пер.) Рабочий |
| Завулак (зав.) Радужны | Переулок (пер.) Радужный |
| Завулак (зав.) Рамонкавы | Переулок (пер.) Ромашковый |
| Завулак (зав.) Ранішні | Переулок (пер.) Утренний |
| Завулак (зав.) **С**адовы | Переулок (пер.) Садовый |
| Завулак (зав.) Сакавіцкі | Переулок (пер.) Мартовский |
| Завулак (зав.) Салдацкі | Переулок (пер.) Солдатский |
| Завулак (зав.) Светлы | Переулок (пер.) Светлый |
| Завулак (зав.) Сонечны | Переулок (пер.) Солнечный |
| Завулак (зав.) Спакойны | Переулок (пер.) Спокойный |
| Завулак (зав.) Стралковы | Переулок (пер.) Стрелковый |
| Завулак (зав) Сярэдні | Переулок (пер) Средний |
| Завулак (зав.) **Т**рактарны | Переулок (пер.) Тракторный |
| Завулак (зав.) Тэвельскі | Переулок (пер.) Тевельский |
| Завулак (зав.) **У**раджайны | Переулок (пер.) Урожайный |
| Завулак (зав.) Утульны | Переулок (пер.) Уютный |
| Завулак (зав.) **Ф**руктовы | Переулок (пер.) Фруктовый |
| Завулак (зав.) **Ц**алінны | Переулок (пер.) Целинный |
| Завулак (зав.) Ціхі | Переулок (пер.) Тихий |
| Завулак (зав.) Цяністы | Переулок (пер.) Тенистый |
| Завулак (зав.) **Ч**аромхавы | Переулок (пер.) Черемуховый |
| Завулак (зав.) Чырвоны | Переулок (пер.) Красный |
| Завулак (зав.) **Ш**олахава | Переулок (пер.) Шолохова |
| Завулак (зав.) **Ю**білейны | Переулок (пер.) Юбилейный |
| Завулак (зав.) **Я**блыневы | Переулок (пер.) Яблоневый |
| Завулак (зав.) Ясеніна | Переулок (пер.) Есенина |
| Завулак (зав.) Ясны | Переулок (пер.) Ясный |

## ВУЛІЦЫ Г. КОБРЫНА

| | |
|---|---|
| Вул. 9 Мая | Ул. 9 Мая |
| Вул. 17 верасня | Ул. 17 сентября |
| Вул. 50 гадоў БССР | Ул. 50 лет БССР |
| Вул. 700-годдзя Кобрына | Ул. 700-летия Кобрина |
| Вул. **А**лега Кашавога | Ул. Олега Кошевого |
| Вул. Альховая | Ул. Ольховая |
| Вул. Аляксандра Неўскага | Ул. Александра Невского |

| | |
|---|---|
| Вул. Андронаўская | Ул. Андроновская |
| Вул. Арджанікідзе | Ул. Орджоникидзе |
| Вул. Астроўскага | Ул. Островского |
| Вул. Аэрадромная | Ул. Аэродромная |
| Вул. **Б**азарная | Ул. Базарная |
| Вул. Барысаўская | Ул. Борисовская |
| Вул. Беларуская | Ул. Белорусская |
| Вул. Берагавая | Ул. Береговая |
| Вул. Брацкая | Ул. Братская |
| Вул. Бруснічная | Ул. Брусничная |
| Вул. Быкава | Ул. Быкова |
| Вул. Бялінскага | Ул. Белинского |
| Вул. Бяроставая | Ул. Берестовая |
| Вул. **В**асільковая | Ул. Васильковая |
| Вул. Верталётная | Ул. Вертолётная |
| Вул. Веры Харужай | Ул. Веры Хоружей |
| Вул. Воінаў-Інтэрнацыяналістаў | Ул. Воинов-Интернационалистов |
| Вул. **Г**агарына | Ул. Гагарина |
| Вул. Гайдара | Ул. Гайдара |
| Вул. Гандлёвая | Ул. Торговая |
| Вул. Гастэлы | Ул. Гастелло |
| Вул. Герцэна | Ул. Герцена |
| Вул. Гетмана | Ул. Гетмана |
| Вул. Гогаля | Ул. Гоголя |
| Вул. Горкага | Ул Горького |
| Вул. Гранічная | Ул. Граничная |
| Вул. Грыбаедава | Ул. Грибоедова |
| Вул. Гусарская | Ул. Гусарская |
| Вул. **Д**абралюбава | Ул. Добролюбова |
| Вул. Далубоўская | Ул. Долубовская |
| Вул. Даніleўскай | Ул. Данилевской |
| Вул. Дастаеўскага | Ул. Достоевского |
| Вул. Дзекабрыстаў | Ул. Декабристов |
| Вул. Дземчука | Ул. Демчука |
| Вул. Дзяржынскага | Ул. Дзержинского |
| Вул. Дружбы | Ул. Дружбы |
| Вул. **Ж**укоўскага | Ул. Жуковского |
| Вул. Жытняя | Ул. Житняя |
| Вул. **З**агарадная | Ул. Загородная |
| Вул. Заморына | Ул. Заморина |
| Вул. Зарэчная | Ул. Заречная |
| Вул. Заслонава | Ул. Заслонова |
| Вул. Зоі Касмадзям’янскай | Ул. Зои Космодемьянской |
| Вул. Зорная | Ул. Звёздная |
| Вул. Зялёная | Ул. Зелёная |
| Вул. **І**нтэрнацыянальная | Ул. Интернациональная |

| | |
|---|---|
| Вул. **К**аапературыўная | Ул. Кооперативная |
| Вул. Калініна | Ул. Калинина |
| Вул. Каліноўскага | Ул. Калиновского |
| Вул. Камарова | Ул. Комарова |
| Вул. Камсамольская | Ул. Комсомольская |
| Вул. Камянецкая | Ул. Каменецкая |
| Вул. Канеўская | Ул. Каневская |
| Вул. Каралёва | Ул. Королёва |
| Вул. Касманаўтаў | Ул. Космонавтов |
| Вул. Кастрычніцкая | Ул. Октябрьская |
| Вул. Кахульская | Ул. Кахульская |
| Вул. Каштанавая | Ул. Каштановая |
| Вул. Кірава | Ул. Кирова |
| Вул. Кірмановіча | Ул. Кирмановича |
| Вул. Кіселявецкая | Ул. Киселевецкая |
| Вул. Клубнічная | Ул. Клубничная |
| Вул. Ключавая | Ул. Ключевая |
| Вул. Краўчука | Ул. Кравчука |
| Вул. Крылова | Ул. Крылова |
| Вул. Куйбышава | Ул. Куйбышева |
| Вул. Кутузава | Ул. Кутузова |
| Вул. **Л**еванеўскага | Ул. Левоневского |
| Вул. Леніна | Ул. Ленина |
| Вул. Лермантава | Ул. Лермонтова |
| Вул. Лівенская | Ул. Ливенская |
| Вул. Лінейная | Ул. Линейная |
| Вул. Льняная | Ул. Льняная |
| Вул. Лясная | Ул. Лесная |
| Вул. **М**ажайскага | Ул. Можайского |
| Вул. Майская | Ул. Майская |
| Вул. Малінавая | Ул. Малиновая |
| Вул. Марозава | Ул. Морозова |
| Вул. Мартынава | Ул. Мартынова |
| Вул. Маршала Жукава | Ул. Маршала Жукова |
| Вул. Матросава | Ул. Матросова |
| Вул. Маякоўскага | Ул. Маяковского |
| Вул. Мележа | Ул. Мележа |
| Вул. Мікалаева | Ул. Николаева |
| Вул. Мікольская | Ул. Никольская |
| Вул. Міра | Ул. Мира |
| Вул. Мічурына | Ул. Мичурина |
| Вул. Мопраўская | Ул. Мопровская |
| Вул. Мядовая | Ул. Медовая |
| Вул. **Н**абярэжная | Ул. Набережная |
| Вул. Навасёлаў | Ул. Новосёлов |
| Вул. Настасіча | Ул. Настасича |

| | |
|---|---|
| Вул. Някрасава | Ул. Некрасова |
| Вул. Новая | Ул. Новая |
| Вул. **П**алеская | Ул. Полесская |
| Вул. Палкавая | Ул. Полковая |
| Вул. Палявая | Ул. Полевая |
| Вул. Паляўнічая | Ул. Охотничья |
| Вул. Панфілаўцаў | Ул. Панфиловцев |
| Вул. Паркавая | Ул. Парковая |
| Вул. Партызанская | Ул. Партизанская |
| Вул. Паўднёвая | Ул. Южная |
| Вул. Паўночная | Ул. Северная |
| Вул. Першамайская | Ул. Первомайская |
| Вул. Пісемскага | Ул. Писемского |
| Вул. Піянерская | Ул. Пионерская |
| Вул. Пралетарская | Ул. Пролетарская |
| Вул. Прамысловая | Ул. Промышленная |
| Вул. Прамяністая | Ул. Лучистая |
| Вул. Працоўная | Ул. Трудовая |
| Вул. Прывакзальная | Ул. Привокзальная |
| Вул. Пуганава | Ул. Пуганова |
| Вул. Пушкіна | Ул. Пушкина |
| Вул. **Р**адзішчава | Ул. Радищева |
| Вул. Ракасоўскага | Ул. Рокоссовского |
| Вул. Ракітная | Ул. Ракитная |
| Вул. Рэвалюцыйная | Ул. Революционная |
| Вул. **С**авецкая | Ул. Советская |
| Вул. Сандалава | Ул. Сандалова |
| Вул. Сасновая | Ул. Сосновая |
| Вул. Саўгасная | Ул. Совхозная |
| Вул. Свярдлова | Ул. Свердлова |
| Вул. Сельская | Ул. Сельская |
| Вул. Славянская | Ул. Славянская |
| Вул. Спартыўная | Ул. Спортивная |
| Вул. Стадыённая | Ул. Стадионная |
| Вул. Суворава | Ул. Суворова |
| Вул. Сурына | Ул. Сурина |
| Вул. Сучасная | Ул. Современная |
| Вул. **Т**алстога | Ул. Толстого |
| Вул. Тапалінае | Ул. Тополиная |
| Вул. Тармасава | Ул. Тормасова |
| Вул. Твардоўскага | Ул. Твардовского |
| Вул. Тургенева | Ул. Тургенева |
| Вул. Тухачэўскага | Ул. Тухачевского |
| Вул. **У**сходняя | Ул. Восточная |
| Вул. Ушынскага | Ул. Ушинского |
| Вул. **Ф**абрычная | Ул. Фабричная |

| | |
|---|---|
| Вул. Фестывальная | Ул. Фестивальная |
| Вул. Францыска Скарыны | Ул. Франциска Скорины |
| Вул. Фрунзе | Ул. Фрунзе |
| Вул. **Х**войная | Ул. Хвойная |
| Вул. **Ц**агельная | Ул. Кирпичная |
| Вул. Ціхарэцкая | Ул. Тихорецкая |
| Вул. Цыялкоўскага | Ул. Циолковского |
| Вул. Цэнтральная | Ул. Центральная |
| Вул. **Ч**апаева | Ул. Чапаева |
| Вул. Чарнышова | Ул. Чернышова |
| Вул. Чкалава | Ул. Чкалава |
| Вул. Чыгуначная | Ул. Железнодорожная |
| Вул. Чырвонаармейская | Ул. Красноармейская |
| Вул. Чырвонагвардзейская | Ул. Красногвардейская |
| Вул. Чыстая | Ул. Чистая |
| Вул. Чэхава | Ул. Чехова |
| Вул. **Ш**аўчэнкі | Ул. Шевченко |
| Вул. Школьная | Ул. Школьная |
| Вул. Штабная | Ул. Штабная |
| Вул. Шчорса | Ул. Щорса |
| Вул. Шырокая | Ул. Широкая |
| Вул. **э**кіпажа Бяліцкага | Ул. экипажа Белицкого |
| Вул. Энтузіястаў | Ул. Энтузиастов |
| Вул. **Я**горава | Ул. Егорова |
| Вул. Якуба Коласа | Ул. Якуба Коласа |
| Вул. Янкі Купалы | Ул. Янки Купалы |
| Вул. Янтарная | Ул. Янтарная |
| Вул. Ясянёвая | Ул. Ясеневая |

# СІСТЭМАТЫЗАЦЫЯ ВУЛІЦ

## ПЕРСАНАЛІІ

*Мы называем вуліцы таксісту, уводзім у навігатары, пішам на канвертах… Але часта нават і не падазраваем у гонар каго, а дакладней, за якія заслугі на шэрагу дамоў нашага горада змешчаны таблічкі з прозвішчамі.*

*У Кобрыне, як і ў любым іншым беларускім горадзе, значная частка вуліц носіць імёны знакамітых людзей. Яны названы ў гонар дзяржаўных, палітычных дзеячаў, рускіх, беларускіх, савецкіх пісьменнікаў, герояў вайны, палкаводцаў, касманаўтаў, навукоўцаў… Хтосьці з іх мае сусветную вядомасць і ў прадстаўленні не мае патрэбы, хтосьці вядомы больш на сваёй малой радзіме. Памяць пра гэтых людзей, ушанаваная ў назвах вуліц, захоўвае для нас іх імёны і іх справы.*

# ДЗЯРЖАЎНЫЯ, ПАЛІТЫЧНЫЯ ДЗЕЯЧЫ

**ВУЛІЦА І ПЛОШЧА ЛЕНІНА**. Наўрад ці знойдзецца ў нашай краіне горад, у якім адна з цэнтральных вуліц ці плошчаў не насіла б імя вялікага правадыра чалавецтва Уладзіміра Ільіча Леніна (1870-1924). Ёсць такая вуліца і плошча і ў нашым горадзе.





**ВУЛІЦА АРДЖАНІКІДЗЕ** названа ў гонар Грыгорыя Канстанцінавіча Арджанікідзе (1886-1937) - вядомага грузінскага бальшавіка, савецкага дзяржаўнага і партыйнага дзеяча, рэвалюцыянера.

**ВУЛІЦА ДЗЯРЖЫНСКАГА** названа ў гонар Фелікса Эдмундавіча Дзяржынскага (1877–1926) - дзеяча рэвалюцыйнага руху і савецкай дзяржавы, аднаго з заснавальнікаў савецкіх органаў бяспекі і разведкі.

Рашэннем Кобрынскага гарвыканкама № 166 ад 29 ліпеня 1977 года вуліцы Влодаўскае шасэ прысвоена сучасная назва - вуліца Дзяржынскага.




**ВУЛІЦА КАЛІНІНА** названа ў гонар Міхаіла Іванавіча Калініна (1875-1946) – дзеяча КПСС і савецкай дзяржавы, Героя Сацыялістычнай працы.

**ВУЛІЦА КІРАВА** названа ў гонар Сяргея Міронавіча Кірава (1886-1943) - расійскага рэвалюцыянера, савецкага дзяржаўнага і палітычнага дзеяча.

**ВУЛІЦА КУЙБЫШАВА** названа ў гонар Валерыяна Уладзіміравіча Куйбышава (1888-1935) - рэвалюцыянера, савецкага дзяржаўнага і палітычнага дзеяча.

**ВУЛІЦА СВЯРДЛОВА** названа ў гонар Якава Міхайлавіча Свярдлова (1885-1919) - расійскага палітычнага і дзяржаўнага дзеяча, рэвалюцыянера, бальшавіка.

**ВУЛІЦА ФРУНЗЕ** названа ў гонар Міхаіла Васільевіча Фрунзе (1885-1925) - рэвалюцыянера, савецкага дзяржаўнага і ваеннага дзеяча, аднаго з найбольш выдатных военачальнікаў Чырвонай Арміі ў гады Грамадзянскай вайны, ваеннага тэарэтыка.

Рашэннем гарвыканкама № 507 ад 17 лістапада 1960 года новай вуліцы прысвоена імя Фрунзэ.

## ГІСТАРЫЧНЫЯ АСОБЫ

**ВУЛІЦА АЛЯКСАНДРА НЕЎСКАГА** названа ў гонар Аляксандра Яраславіча Неўскага (1221-1263) – вялікага князя Кіеўскага (1249-1263 гг.), Уладзімірскага (1252-1263 гг.), прылічанага да святых. З роду Рурыкавічаў. Вядомы сваімі перамогамі над шведамі ў 1240 г. на берагах Нявы (за што і атрымаў ганаровую мянушку), і над тэўтонскімі рыцарамі ў 1242 г. (Лядовае пабоішча).

У Кобрыне ёсць Сабор Аляксандра Неўскага – галоўная праваслаўная святыня горада.

**ВУЛІЦА КАЛІНОЎСКАГА** названа ў гонар Кастуся Каліноўскага (1838-1864) - нацыянальнага героя Беларусі, аднаго з кіраўнікоў нацыянальна-вызваленчага паўстанння 1863-1864 гг., рэвалюцыянера-дэмакрата, публіцыста, паэта.

**ВУЛІЦА ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ** названа ў гонар Францыска Скарыны (1486-1551) - беларускага і ўсходнеславянскага першадрукара, асветніка, філосафа-гуманіста, пісьменніка, грамадскага дзеяча. Францыск Скарына лічыцца адным з найвыбітнейшых гістарычных дзеячаў Беларусі за ўсю гісторыю. У гонар яго названыя вышэйшыя ўзнагароды краіны: мэдаль і ордэн. Яго імя носяць Гомельскі ўніверсітэт, галоўная бібліятэка краіны, гімназія № 1 у Полацку, гімназія № 1 у Мінску і іншыя арганізацыі і аб’екты. У гонар Ф. Скарыны ў розных краінах усталяваны помнікі, зроблены скульптурныя і жывапісныя выявы, названы вуліцы, плошчы.

Кабрынчане ганарацца, што ў горадзе ёсць вуліца Францыска Скарыны, і прысвячаюць шмат мерапрыемстваў да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, якое адзначаецца ў бягучым 2017 годзе і непасрэдна звязана з Ф. Скарынай, які паклаў пачатак айчыннаму кнігадрукаванню, зрабіў чытанне больш даступным і танным.

# ВАЕННЫЯ ДЗЕЯЧЫ

*Кутузаў, Сувораў, Чапаеў, Шчорс, Ракасоўскі, Тухачэўскі...*

*Кожнае з гэтых імён годна займае сваё месца ў летапісы ваенных дзеянняў, а вуліцы, названыя ў гонар гэтых палкаводцаў, ваенных дзеячаў, упрыгожваюць наш горад.*

**ВУЛІЦА СУВОРАВА.** У шматлікіх людзей наш горад асацыіруецца з імем вялікага і непераможнага палкаводца, генералісімуса, генерал-фельдмаршала Аляксандра Васільевіча Суворава (1730-1800), з якім злучана гісторыя Кобрына і які пакінуў пасля сябе ў горадзе добрую памяць, - дом, які яму належыў і дзе цяпер адкрыты музей; выдатны парк, у якім векавыя дрэвы і сажалка яшчэ памятаюць свайго першага гаспадара. Недарма адна з галоўных вуліц Кобрына называецца Сувораўскай. У нядаўні час менавіта гэта вуліца ў гістарычным цэнтры горада стала пешаходнай, што павышае прывабнасць нашага горада ў вачах турыстаў.



**ВУЛІЦА МАРШАЛА ЖУКАВА** названа ў гонар Георгія Канстанцінавіча Жукава (1896-1974) - маршала і чатыры разы Героя Савецкага Саюза (1939, 1944, 1945, 1956), Героя Манголіі (1969). Імем Жукава названа малая планета.



Па рашэнні выканкама № 127 ад 18 мая 1989 г. вуліца Жданава была перайменавана ў вуліцу Маршала Жукава. Вуліца знаходзіцца ў цэнтральнай частцы горада.

**ВУЛІЦА КУТУЗАВА** названа ў гонар Міхаіла Іларыёнавіча Кутузава (1745-1813) - славутага расійскага палкаводца, генерал-фельдмаршала (з 1812 г.), Героя вайны 1812 года, поўнага кавалера ордэна Святога Георгія. Рашэннем гарвыканкама № 337 ад 29 жніўня 1962 г. вуліца Тэвельская перайменавана ў вуліцу Кутузава.

**ВУЛІЦА МАЖАЙСКАГА** названа ў гонар Александра Фёдаравіча Мажайскага (1825-1890) - рускага ваеннага дзеяча – контр-адмірала, вынаходніка - піянера авіяцыі. Спраектаваў і пабудаваў першы ў Расіі і адзін з першых у свеце самалёт.

Рашэннем гарвыканкама № 24 ад 30 студзеня 1957 года завулку, які ўтварыўся ад вуліцы Тэвельскай да аэрадрома, прысвоена назва Мажайскага (пазней – вуліца).

**ВУЛІЦА РАКАСОЎСКАГА** названа ў гонар Канстанціна Ксавер'евіча Ракасоўскага (1894-1968) - савецкага военачальніка, Маршала Савецкага Саюза (1944 г.), маршала Польшчы (1949 г.), двойчы Героя Савецкага Саюза (1944, 1945).

**ВУЛІЦА ТАРМАСАВА** названа ў гонар Аляксандра Пятровіча Тармасава (1752-1819) - генерала, які прынёс Расійскай Імперыі перамогу над Напалеонам. Ён адзіны быў узнагароджаны за вайну 1812 г. вышэйшай узнагародай - ордэнам Св. апостала Андрэя Першазванага. У шэраг герояў Айчыннай вайны Тармасава вылучыла перамога пад Кобрынам, які ўвайшоў у гісторыю вайны 1812 г. як горад, дзе была здабыта першая бясспрэчная перамога рускага войска над войскамі Напалеона Банапарта 15(27) ліпеня 1812 г.

Рашэннем гарвыканкама № 57 ад 6 красавіка 1965 г. праезд у раёне вул. Кутузава (працяг вул. Марозава) названы вуліцай Тармасава.

**ВУЛІЦА ТУХАЧЭЎСКАГА** названа ў гонар Міхаіла Мікалаевіча Тухачэўскага (1893-1937) - савецкага ваеннага дзеяча, Маршала Савецкага Саюза (1935 г.).

Рашэннем гарвыканкама № 83 ад 11 сакавіка 1966 г. новай вуліцы ў раёне вуліцы Кутузава прысвоена імя Тухачэўскага.

**ВУЛІЦА ЧАПАЕВА** названа ў гонар Васілія Іванавіча Чапаева (1887-1919) - начальніка дывізіі Чырвонай арміі, удзельніка Першай сусветнай і Грамадзянскай войнаў, Кавалера трох Георгіеўскіх крыжоў і Георгіеўскай медалі, Кавалера ордэна Чырвонага Сцяга.

**ВУЛІЦА ШЧОРСА** названа ў гонар Мікалая Аляксандравіча Шчорса (1895-1919) – палітычнага дзеяча, члена Камуністычнай партыі, чырвонага камандзіра.

Рашэннем гарвыканкама № 278 ад 16 лістапада 1955 г. новаўтворанай вуліцы прысвоена найменне Шчорса.



# ГЕРОІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ

*Вялікая Айчынная вайна пакінула свае жорсткія адзнакі ў лёсах многіх людзей, у гісторыі гарадоў, пасёлкаў, вёсак. Загінула больш 20 мільёнаў чалавек. Некаторыя з іх вярнуліся да нас у назвах вуліц, плошчаў, паркаў, сквераў. Гэтыя назвы быццам жывыя сведкі апавядаюць пра бяспрыкладны подзвіг і мужнасць удзельнікаў вайны.*

*Удзячная памяць захавала такія прозвішчы і ў нашым горадзе. Кабрынчане свята шануюць і захоўваюць памяць аб тых, хто загінуў у баях з ворагам. 22 вуліцы горада носяць імёны герояў, удзельнікаў Вялікай Айчыннай. Назвы вуліц нагадваюць і пра тых, хто аддаў жыццё за вызваленне Кобрыншчыны. На кобрынскай зямлі здзейснілі свой подзвіг В. П. Пуганаў, А. І. Марозаў, А. Ф. Данілеўская, Б. М. Сурын, Л. М. Сандалаў, П. Гетман, Ц. М. Краўчук, С. Я. Ягораў. У гонар тых, хто загінуў вызваляючы Кобрын, хто мужна змагаўся пры абароне яго і праявіў гераізм, названы 8 вуліц нашага горада.*

**ВУЛІЦА АЛЕГА КАШАВОГА** названа ў гонар Алега Васільевіча Кашавога (1926-1943) - удзельніка, аднаго з арганізатараў падпольнай антыфашысцкай арганізацыі «Маладая гвардыя», арганізатара і кіраўніка шматлікіх баявых аперацый у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Рашэннем Кобрынскага выканкама № 239 ад 27 верасня 1955 г. вуліца атрымала назву Алега Кашавога.

**ВУЛІЦА ВЕРЫ ХАРУЖАЙ** названа ў гонар Веры Захараўны Харужай (1903-1942) - Героя Савецкага Саюза, партызанскай актывісткі, сакратара ЦК Камуністычнага саюза моладзі Заходняй Беларусі.

Гэту назву вуліца атрымала 11 сакавіка 1966 г. рашэннем Кобрынскага выканкама № 83. Вуліца знаходзіцца ў цэнтральнай часцы горада.

**ВУЛІЦА ГАСТЭЛЫ** названа ў гонар Мікалая Францавіча Гастэлы (1907-1941) - савецкага ваеннага лётчыка, камандзіра авіяэскадрыллі, Героя Савецкага Саюза. На вуліцы размешчаны Школа мастацтваў і Аквапарк.



Гэту назву вуліца атрымалі 15 лістапада 1948 года па рашэнні Кобрынскага гарадскога выканаўчага камітэта № 193.

**ВУЛІЦА ГЕТМАНА** названа ў гонар Паўла Гетмана - удзельніка падпольнага руху, ураджэнца в. Патрыкі.

Імя нашага земляка прысвоена адной з вуліц г. Кобрына па рашэнні сесіі раеннага Савета дэпутатаў 12 кастрычніка 2005 г.

**ВУЛІЦА ДАНІЛЕЎСКАЙ** названа ў гонар Алісы Фёдараўны Данілеўскай (1893-1944) - адважнай патрыёткі, партызанкі. На нашай кобрынскай зямлі А. Данілеўская зрабіла апошні крок у бессмяротнасць.

Гэту назву вуліца атрымала 15 мая 1963 г. (па рашэнні Кобрынскага гарвыканкама № 199). Вуліца знаходзіцца ў цэнтральнай часцы горада.

**ВУЛІЦА ЗАМОРЫНА** названа ў гонар Івана Аляксандравіча Заморына (1918-1993) - легендарнага лётчыка, камандзіра знішчальнага авіяцыйнага палка. Знакамітага лётчыка тройчы прадстаўлялі да прысваення звання Героя Савецкага Саюза, якое ён так і не атрымаў. А вось вышэйшую ўзнагароду Францыі - ордэн Ганаровага легіёна - беларускаму лётчыку ўручаў асабіста прэзідэнт гэтай краіны Франсуа Мітэран у азнаменаванне 40-годдзя Перамогі ў Другой сусветнай вайне.

На адным з дамоў па вуліцы Пушкіна знаходзіцца мемарыяльная дошка І. А. Заморыну. На дошцы тэкст: «*У гэтым доме з 1974 па 1993 г. жыў ЗАМОРЫН Іван Аляксандравіч. У Вялікую Айчынную вайну - камандзір 523 знішчальнага авіяцыйнага палка. Ваяваў сумесна з лётчыкамі палка «Нармандыя-Неман». Здзейсніў 342 баявых вылеты, асабіста збіў 9 фашысцкіх самалетаў і 12 - у складзе групы. Кавалер 9-ці ордэнаў СССР і 2-х Францыі*».

Два апошнія дзесяцігоддзі свайго жыцця А. І. Заморын жыў у Кобрыне, пахаваны на гарадскіх могілках (1993 г.).

**ВУЛІЦА ЗАСЛОНАВА** названа ў гонар Канстанціна Сяргеевіча Заслонава (1910-1942) - героя Вялікай Айчыннай вайны, аднаго з арганізатараў і кіраў-нікоў партызанскага падполля і парты-занскага руху ў Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну. За заслугі перад Радзімай і гераізм К. Заслонаву было пасмя-ротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.



Рашэннем райвыканкама № 50 ад 20 кастрычніка 1953 г. вуліца Чыгуначная перайменавана ў вуліцу імя Заслонава. Вуліца знаходзіцца на зарэчнай частцы горада.

**ВУЛІЦА ЗОІ КАСМАДЗЯМ'ЯНСКАЙ** названа ў гонар Зоі Анатольеўны Касмадзям'янскай (1923-1941) - партызанкі, Героя Савецкага Саюза.



Гэту назву вуліца атрымала ў 1948 г. па рашэнні Кобрынскага гарвыканкама № 193 ад 14 лістапада 1948 г.

**ЗАВУЛАК КІЖАВАТАВА** названы ў гонар Андрэя Мітрафанавіча Кіжаватава (1907-1941) - начальніка 9 пагранзаставы 17-га Брэсцкага пагранатрада, які размяшчаўся ў цытадэлі Брэсцкай крэпасці. Воіны заставы пад камандаваннем лейтэнанта Кіжаватава раніцай 22 ліпеня 1941 г. прынялі першы бой з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, адбілі 6 атак, двойчы контратакавалі. Імя Кіжаватава прысвоена пагранічнай заставе, дзе ўстаноўлены яго бюст. У 1965 г. А. М. Кіжаватаву пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Па рашэнні выканкама № 196 ад 27 жніўня 1969 г. у Кобрыне з'явіўся завулак Кіжаватага. Ён знаходзіцца ў зарэчнай часцы горада.

**ВУЛІЦА КІРМАНОВІЧА** названы ў гонар Уладзіміра Мікалаевіча Кірмановіча (1919-2001) - Героя Савецкага Саюза, першага і адзінага выхадца Кобрыншчыны, які атрымаў такое высокае званне, палкоўніка. Шматлікія заслугі У. М. Кірмановіча ў гады Вялікай Айчыннай вайны адзначаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Аляксандра Неўскага, двума ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, ордэнам Айчыннай вайны II ступені, трыма ордэнамі Чырвонай Зоркі і шматлікімі медалямі.

12 кастрычніка 2005 г. на сесіі раённага Савета дэпутатаў прынята рашэнне аб прысваенні вуліцы ў квартале індывідуальнай забудовы на тэрыторыі былога ваеннага гарадка імя земляка-героя У. М. Кірмановіча. На будынку школы № 2 г. Кобрына, у якой вучыўся Кірмановіч, устаноўлена мемарыяльная дошка.

**ВУЛІЦА КРАЎЧУКА** названы ў гонар Цімафея Міхайлавіча Краўчука (1903-1944) – аднаго з арганізатараў падпольнага антыфашысцкага камітэта вёскі Турная, партызана.

6 мая 1965 г. выканкам раённага Савета дэпутатаў працоўных прыняў рашэнне назваць вуліцу ў паўночнай частцы горада імем Ц. М. Краўчука.

**ВУЛІЦА МАТРОСОВА** названа ў гонар Аляксандра Матросова (1924-1943) - Героя Савецкага Саюза, радавога 2-га батальёна 91-й асобнай стралковай брыгады (Калінінскі фронт), подзвіг якога стаў знакам мужнасці, вайсковай доблесці і адважнасці. У польскі перыяд 1921-1939 гг. вуліца звалася Школьнай.



Па рашэнні Кобрынскага выканкама № 177 ад 20 кастрычніка 1948 г. вуліца Школьная перайменавана ў вуліцу Матросава.

**ВУЛІЦА МАРОЗАВА** названа ў гонар Арсена Іванавіча Марозава (1922-1944) - Героя Савецкага Саюза У складзе 149-га Чырвонасцяжнага Памеранскага знішчальнага палка, які базіраваўся на кобрынскім аэрадроме, старшы лейтэнант А. Марозаў быў намеснікам камандзіра эскадрыллі. 24 чэрвеня 1944 г. геройскі загінуў.

Пахаваны ў Кобрыне ў скверы, які сёння носіць яго імя. Вуліца знаходзіцца на зарэчнай часцы горада.

**ВУЛІЦА ПАНФІЛАЎЦАЎ** названа ў гонар доблесных воінаў 8-й гвардзейскай стралковай дывізіі імя Героя Савецкага Саюза генерал-маёра Івана Васільевіча Панфілава (панфілаўцаў), якія гераічна змагаліся супраць германскіх войск у час Маскоўскай бітвы 1941-1942 гг. у Вялікую Айчынную вайну. 21 чэрвеня 1942 г. ўдзельнікам гэтага бою было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. 18 лістапада 1941 г. 316-я дывізія атрымала найменне 8-й гвардзейскай, 23 лістапада ёй прысвоена імя Панфілава.



**ВУЛІЦА ПУГАНАВА** названа ў гонар Віктара Паўлавіча Пуганава (1901-1941) – савецкага военачальніка, генерал-маёра танкавых войскаў.

17 чэрвеня 1964 г. па рашэнні выканкама раённага Савета дэпутатаў працоўных завулак Прамы быў перайменаваны ў вуліцу імя Пуганава. Яна размешчана ў паўночна-заходняй часцы горада. Адкрываецца вуліца мемарыяльнай дошкай, на якой мы чытаем

«*Вуліца імя Пуганава Віктара Паўлавіча. Камандзір 22 танкавай дывізіі генерал-маёр Пуганаў загінуў у танку пры абароне Радзімы ў наваколлі горада Кобрына ў вёсцы Імяніны 23 чэрвеня 1941 г.*».

У Кобрыне ёсць сквер імя Пуганава.

**ВУЛІЦА САНДАЛАВА** названа ў гонар Леаніда Міхайлавіча Сандалава (1900-1987) - удзельніка баёў на Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, генерал-палкоўніка (1944 г.), аўтара кніг «Пагарэла-Гарадзішчанская аперацыя» (1960 г.), «Цяжкія рубяжы» (1965 г.), «Перажытае» (1966 г.), «На маскоўскім напрамку» (1970 г.), «Пасля пераломy» (1983 г.). У пачатку Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у абарончых баях у раёне Брэста, Жабінкі, Кобрына і інш.

**ВУЛІЦА СУРЫНА** названа ў гонар Барыса Мікалаевіча Сурына (1907-1941) - камандзіра эскадрыллі знішчальнага авіяпалка, які абараняў наш горад 22 чэрвеня 1941 года. У першы дзень вайны лётчыкі палка на працягу дзесяці гадзін вялі бесперапынны паветраны бой і збілі 30 варожых самалётаў, страціўшы пры гэтым 9 сваіх. Барыс Сурын у гэты дзень правёў чатыры паветраныя баі, збіў тры самалёты ворага, але сам атрымаў смяротнае раненне.

Па рашэнні Кобрынскага выканкама раённага Савета дэпутатаў працоўных 17 чэрвеня 1964 г. вуліца названа імем Б. М. Сурына.

**ВУЛІЦА ЧАРНЫШОВА** названа ў гонар Васілія Яўхімавіча Чарнышова (1908-1969) - аднаго з арганізатараў і кіраўнікоў патрыятычнага падполля і партызанскага руху на Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, генерал-маёра (1943), Героя Савецкага Саюза (1944), савецкага партыйнага і дзяржаўнага дзеяча.

Вуліца атрымала гэту назву 26 кастрычніка 1979 г. па рашэнні Кобрынскага выканкама № 222.

**ВУЛІЦА ЯГОРАВА** названа ў гонар Сяргея Ягоравіча Ягорава (1901-1944) - камісара атрада імя Варашылава, атрада імя Шчорса, намесніка партызанскага руху па Брэсцкай вобласці па партыйна-масавай рабоце (1943).

У 1964 г. да 20-годдзя вызвалення г. Кобрына па рашэнні райвыканкама завулак Лугавы перайменаваны ў завулак імя Ягорава (з 2008 г. – вуліца Ягорава).

## *КАСМАНАЎТЫ, ЛЁТЧЫКІ*

**ВУЛІЦА ГАГАРЫНА** названа ў гонар Юрыя Аляксеевіча Гагарына (1934-1968) – савецкага лётчыка-касманаўта, Героя Савецкага Саюза, ганаровага грамадзяніна шматлікіх расійскіх і замежных гарадоў, першага ў свеце чалавека, які здзейсніў 12 красавіка 1961 г. палёт у космас, абляцеў зямны шар за 1 гадзіну 48 хвілін і вярнуўся на зямлю.

Рашэннем гарвыканкама № 246 ад 25 жніўня 1961 г. новай вуліцы прысвоена імя Гагарына.

**ВУЛІЦА КАМАРОВА** названа ў гонар Уладзіміра Міхайлавіча Камарова (1927-1967) – лётчыка-касманаўта № 8, двойчы Героя Героя Савецкага Саюза, інжынера-палкоўніка, камадзіра першага ў міры экіпажа касмічнага карабля.

**ВУЛІЦА ЛЕВАНЕЎСКАГА** названа ў гонар Сігізмунда Аляксандравіча Леванеўскага (1902-1937) - савецкага лётчыка, які здзейсніў некалькі звышдоўгіх авіяпералётаў у 1930-х гадах, удзельніка экспедыцыі па выратаванні парахода «Челюскин»; адным з першых удастоены звання Герой Савецкага Саюза (1934).

**ВУЛІЦА МІКАЛАЕВА** названа ў гонар Андрыяна Рыгоравіча Мікалаева (1929-2004) – касманаўта СССР № 3, двойчы Героя Савецкага Саюза, генерал-маёра авіяцыі, першага касманаўта, які працаваў на арбіце без скафандра (сумесна з Севасцьянавым).



Рашэннем гарвыканкама № 389 ад 27 верасня 1962 г. праезду, які ўтварыўся ў раёне мэблевай фабрыкі, прысвоена імя Мікалаева.

**ВУЛІЦА НАСТАСІЧА** названа ў гонар Мілана Георгіевіча Настасіча (1923-1999) – палкоўніка, лётчыка. У жніўні 1962 г. М. Г. Настасіч прызначаны камандзірам сфарміраванага ім 65-га асобнага верталётнага палка, які з 1964 г. базіраваўся ў Кобрыне. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны II ступені, а таксама югаслаўскімі «За заслугі перад народам» II ступені і «За храбрасць».

Рашэннем гарвыканкама ад 22 лютага 2000 г. вуліцы прысвоена імя Настасіча.

**ВУЛІЦА ЧКАЛАВА** названа ў гонар Валерыя Паўлавіча Чкалава (1904-1938) - савецкага лётчыка-выпрабавальніка, камбрыга, Героя Савецкага Саюза, камандзіра экіпажа самалёта, які здзейсніў у 1937 г. першы беспасадкавы пералёт праз Паўночны полюс з Масквы ў Ванкувер.

**ВУЛІЦА ЭКІПАЖА БЯЛІЦКАГА** названа ў гонар экіпажа Леаніда Мікалаевіча Бяліцкага – капітана, лётчыка першага класа, ураджэнца г. Віцебска. Служыў у Беларускай ваеннай акрузе (вайсковая частка 97978, г. Кобрын). У 1983 г. быў накіраваны ў Афганістан, здзейсніў больш за 700 баявых вылетаў. 27 жніўня 1984 г. капітан Л. Н. Белицкий загінуў. За мужнасць і гераізм узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «За адвагу». 2 жніўня 1984 г. быў прадстаўлены да звання Героя Савецкага Саюза. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Леніна і медалём «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа». Яго імем названа адна з вуліц горада Віцебска.

# НАВУКОЎЦЫ

**ВУЛІЦА ДЗЕМЧУКА** названа ў гонар Міхаіла Іванавіча Дземчука (1946-2016) - вядомага дзяржаўнага грамадскага дзеяча, члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктара фізіка-матэматычных навук, прафесара, заслужанага дзеяча навук Рэспублікі Беларусь, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР, беларускага вучонага з вёскі Дзевяткі Кобрынскага раёна, спецыяліста ў галіне навуковага прыборабудавання і квантавай радыёфізікі, аўтара больш за 300 навуковых прац.

Вуліца атрымала назву рашэннем кобрынскага Савета народных дэпутатаў ад 19 чэрвеня 2013 г. № 167.

**ВУЛІЦА КАРАЛЁВА** названа ў гонар Сяргея Паўлавіча Каралёва (1907-1966) - савецкага навукоўца, інжынера-канструктара, галоўнага арганізатара вытворчасці ракетна-касмічнай тэхнікі і ракетнай зброі СССР і заснавальніка практычнай касманаўтыкі.

Рашэннем гарвыканкама № 196 ад 27 жніўня 1969 г. новай вуліцы прысвоена імя акадэміка С. П. Каралева.

**ВУЛІЦА МАРТЫНАВА** названа ў гонар Аляксея Міхайлавіча Мартынава (1904-1999) - даследчыка гісторыі Кобрыншчыны, збіральніка рэдкіх дакументаў аб яе мінулым, Ганаровага грамадзяніна Кобрына, першага і шматгадовага дырэктара музея імя А. В. Суворава, арганізатара і першага загадчыка гарадской бібліятэкі. Пад яго кіраўніцтвам музей стаў адным з лепшых у Беларусі, дзе сабраны ўнікальныя калекцыі зброі, нумізматыкі. А. М. Мартынаў удзельнічаў у грамадскім жыцці Кобрыншчыны: у 1960-я гады арганізаваў раённае аддзяленне Таварыства аховы прыроды, у 1966 г. - Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, якое ўзначальваў да 1972 г. Вёў вялікую краязнаўчую работу. Яго артыкулы, нарысы сталі першакрыніцамі па вывучэнні і асэнсаванні мінулага роднага краю. Узнагароджаны медалём імя Н. К. Крупскай.

Вуліца атрымала назву рашэннем кобрынскага Савета народных дэпутатаў ад 26 сакавіка 2010 г. № 118.

**ВУЛІЦА МІЧУРЫНА** названа ў гонар Івана Уладзіміравіча Мічурына (1855-1935) - рускага біёлага і селекцыянера, аўтара шматлікіх сартоў пладова-ягадных культур, доктара біялогіі, заслужанага дзеяча навукі і тэхнікі, ганаровага члена Акадэміі навук СССР, акадэміка Усесаюзнай акадэміі сельскагаспадарчых навук імя Леніна (УАСХНІЛ).

Рашэннем гарвыканкама № 147 ад 9 чэрвеня 1956 г. новай вуліцы, размешчанай паміж вуліцай А. Кашавога і завулкам Кароткі прысвоена найменне Мічурына.

**ВУЛІЦА ЦЫЯЛКОЎСКАГА** названа ў гонар Канстанціна Эдуардавіча Цыялкоўскага (1857-1935) - рускага і савецкага вучонага, даследчыка, заснавальніка сучаснай касманаўтыкі, аўтара прац па аэрадынаміцы, паветраплаванні і іншых навуках.

Рашэннем гарвыканкама № 123 ад 26 сакавіка 1959 года завулку, які праходзіць ад вуліцы Тэвельскай, прысвоена імя Цыялкоўскага (пазней – вуліца).

# ПІСЬМЕННІКІ, ЛІТАРАТАРЫ, КРЫТЫКІ, ПУБЛІЦЫСТЫ

*Кобрын прыцягваў да сабе не толькі палкаводцаў, але і паэтаў. У нашым горадзе ў свой час служыў аўтар бессмяротнай камедыі «Горе от ума» Аляксандр Грыбаедаў, У 1939 г. у доме № 1 па вуліцы Суворава жыў ужо вядомы ў той час паэт, творца «Василия Тёркина» А. Т. Твардоўскі. І, безумоўна ў горадзе ёсць вуліцы, якія носяць імёны гэтых рускіх пісьменнікаў.*

*З агульнай колькасці назваў плошчаў, вуліц. завулкаў у Кобрыне 30 названы прозвішчамі пісьменнікаў. Вуліца Пушкіна - гэта аорта нашага горада. Куды б ты ні трымаў свой шлях, з поўдня на поўнач ці з захаду на ўсход, немінуча пройдзеш па ёй. Вуліцы Бялінскага, Гогаля, Грыбаедава, Дастаеўскага, Лермантава, Някрасава, Тургенева нагадваюць нам класікаў рускай літаратуры. Цяжка прадставіць наш горад без беларускіх песняроў Якуба Коласа і Янкі Купалы, без народнага пісьменніка БССР Васіля Быкава, Івана Мележа. Гістарычным напамінам сяброўства народаў, беларускага народа са сваімі суседзямі-сябрамі з'яўляюцца вуліцы Адама Міцкевіча і Тараса Шаўчэнка.*

**ВУЛІЦА АСТРОЎСКАГА** названа ў гонар Мікалая Аляксеевіча Астроўскага (1904-1936) – савецкага пісьменніка, аўтара рамана «Как закалялась сталь».

Рашэннем гарвыканкама № 254 ад 29 мая 1963 г. вуліцы прысвоены імя Астроўскага.

**ВУЛІЦА БЫКАВА** названа ў гонар Васілія Уладзіміравіча Быкава (1924 - 2003) - выдатнага беларускага пісьменніка і грамадскага дзеяча, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, народнага пісьменніка БССР (1980 г.). Большасць твораў - аповесці пра Вялікую Айчынную вайну, дзеянні якіх адбываецца падчас Вялікай Айчыннай вайны і ў якіх паказаны маральны выбар чалавека ў найбольш драматычныя моманты жыцця.

**ВУЛІЦА БЯЛІНСКАГА** названа ў гонар Вісарыёна Рыгоравіча Бялінскага (1811-1848) – рускага літаратурнага крытыка, публіцыста, філосафа, пісьменніка.

**ВУЛІЦА ГАЙДАРА** названа ў гонар Аркадзія Пятровіча Гайдара (сапраўднае прозвішча - Голікаў; 1904-1941) - рускага савецкага дзіцячага пісьменніка, кінасцэнарыста, удзельніка Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войн.

**ВУЛІЦА ГЕРЦЭНА** названа ў гонар Аляксандра Іванавіча Герцэна (1812-1970) - рускага публіцыста, пісьменніка, філосафа, педагога, які належыў да ліку найбольш значных крытыкаў афіцыйнай ідэалогіі і палітыкі Расійскай імперыі ў XIX ст., прыхільніка рэвалюцыйных буржуазна-дэмакратычных пераўтварэнняў.

**ВУЛІЦА ГОГАЛЯ** названа ў гонар Мікалая Васільевіча Гогаля (1809-1852) - рускага празаіка, драматурга, паэта, крытыка, публіцыста, прызнанага адным з класікаў рускай літаратуры.

Рашэннем гарвыканкама № 50 ад 21 сакавіка 1953 г. вуліца Чыгуначная «А» перайменавана ў вуліцу Гогаля.

**ВУЛІЦА ГОРКАГА** названа ў гонар Максіма Горкага (сапраўднае імя Аляксей Максімавіч Пяшкоў; 1868-1936) - рускага пісьменніка, празаіка, драматурга, аднаго з самых значных і вядомых у свеце рускіх пісьменнікаў, лаўрэата Нобелеўскай прэміі па літаратуры (1965).

Рашэннем гарвыканкама № 50 ад 21 сакавіка 1953 г. вуліца Чырвонаармейская «А» перайменавана ў вуліцу Горкага.

**ВУЛІЦА ГРЫБАЕДАВА** названа ў гонар Александра Сяргеевіча Грыбаедава (1795-1829) - рускага дыпламата, паэта, драматурга, піяніста і кампазітара, вядомага дзякуючы п'есе «Горе от ума», якую дагэтуль вельмі часта ставяць у тэатрах Расіі, Беларусі. Будучы карнетам Іркуцкага гусарскага палка, у 1813 г. Аляксандр Грыбаедаў пражыў у Кобрыне некалькі месяцаў.

**ВУЛІЦА ДАБРАЛЮБАВА** названа ў гонар Мікалая Аляксандравіча Дабралюбава (1836-1861) - рускага літаратурнага крытыка, паэта, публіцыста, рэвалюцыйнага дэмакрата.

**ВУЛІЦА ДАСТАЕЎСКАГА** названа ў гонар Фёдара Міхайлавіча Дастаеўскага (1821-1881) – рускага пісьменніка, філосафа і публіцыста, члена-карэспандэнта Пецярбургскай Акадэміі навук з 1877 г.



Рашэннем гарвыканкама № 507 ад 17 лістапада 1960 г. новаўтворанаму праезду прысвоена найменне - завулак імя Дастаеўскага (пазней – вуліца).

Цікавы факт: побач знаходзяцца вуліцы, названыя ў гонар таксама вядомых рускіх пісьменнікаў Тургенева, Крылова і Жукоўскага.

**ВУЛІЦА ЖУКОЎСКАГА** названа ў гонар рускага паэта, заснавальніка рамантызму ў рускай паэзіі, перакладчыка, крытыка Васілія Андрэевіча Жукоўскага (1783-1852).

Рашэннем гарвыканкама № 507 ад 17 лістапада 1960 г. новаўтворанай вуліцы прысвоена імя Жукоўскага.



**ВУЛІЦА КРЫЛОВА** названа ў гонар Івана Андрэевіча Крылова (1769-1844) - рускага публіцыста, паэта, байкапісца, выдаўца сатырыка-асветніцкіх часопісаў, вядомага як аўтара 236 баек, сабраных у дзевяць прыжыццёвых зборнікаў.



Рашэннем Кобрынскага гарвыканкама № 507 ад 17 лістапада 1960 г. новай вуліцы прысвоена імя Крылова.

**ВУЛІЦА ЛЕРМАНТАВА** названа ў гонар Міхаіла Юр'евіча Лерманава (1814-1841) - рускага паэта, празаіка, драматурга, мастака.

Рашэннем гарвыканкама № 233 ад 30 жніўня 1956 г. новай вуліцы прысвоена імя Лермантава.

**ВУЛІЦА МАЯКОЎСКАГА** названа ў гонар Уладзіміра Уладзіміравіча Маякоўскага (1893-1930) – рускага і савецкага паэта, аднаго з заснавальнікаў савецкай літаратуры, найбуйнешага паэта XX ст.

**ВУЛІЦА МЕЛЕЖА** названа ў гонар Івана Паўлавіча Мележа (1921-1976) – беларускага савецкага празаіка, драматурга, публіцыста, народнага пісьменніка Беларускай ССР, лаўрэата Літаратурнай прэміі імя Я. Коласа, лаўрэата Ленінскай прэміі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларускай ССР імя Я. Коласа.

Рашэннем гарвыканкама № 90 ад 22 красавіка 1977 г. вуліцы прысвоена імя Мележа.

**ЗАВУЛАК МІЦКЕВІЧА** названы ў гонар Адама Бернарда Міцкевіча (1798-1855) - польскага паэта, палітычнага публіцыста, дзеяча польскага нацыянальнага руху, які аказаў вялікі ўплыў на станаўленне польскай і беларускай літаратуры XIX ст.

Рашэннем гарвыканкама № 26 ад 12 лютага 1965 г. завулку прысвоена імя Міцкевіча.

**ВУЛІЦА НЯКРАСАВА** названа ў гонар Мікалая Аляксеевіча Някрасава (1821-1878) - рускага паэта, пісьменніка і публіцыста, класіка рускай літаратуры.

Рашэннем гарвыканкама № 50 ад 21 сакавіка 1953 г. вуліца Камуністычная «А» перайменавана ў вуліцу Някрасава.

**ВУЛІЦА ПІСЕМСКАГА** названа ў гонар Аляксея Феафілактавіча Пісемскага (1821-1881) – рускага пісьменніка і драматурга.

**ВУЛІЦА ПУШКІНА** названа ў гонар Аляксандра Сяргеевіча Пушкіна (1799 1837) - вялікага рускага паэта, драматурга і празаіка, які заклаў асновы рускага рэалістычнага кірунку, крытыка і тэарэтыка літаратуры, публіцыста; аднаго з самых аўтарытэтных літаратурных дзеячаў першай паловы XIX стагоддзя.




**ВУЛІЦА РАДЗІШЧАВА** названа ў гонар Аляксандра Мікалаевіча Радзішчава (1749-1802) - расійскага празаіка, паэта, філосафа.

**ВУЛІЦА ТАЛСТОГА** названа ў гонар  Льва Мікалаевіча Талстога (1828-1910) - аднаго з найбольш вядомых рускіх пісьменнікаў, аднаго з найвялікіх пісьменнікаў свету, асветніка, публіцыста, рэлігійнага мысліцеля, аўтарытэтнае меркаванне якога паслужыла ўзнікненню новай рэлігійна-маральнай плыні – талстоўства, члена-карэспандэнта Імператарскай Акадэміі навук (1873).

Рашэннем гарвыканкама № 50 ад 21 сакавіка 1953 г. завулак вуліцы Савецкай «Д» пераназваны ў завулак Л. Талстога (пазней - вуліца).

**ВУЛІЦА ТВАРДОЎСКАГА** названа ў гонар Аляксандра Трыфанавіча Твардоўскага (1910-1971) - рускага савецкага пісьменніка, паэта, журналіста, галоўнага рэдактара часопіса «Новый мир» (1950-1954 гг.; 1958-1970 гг.).

Рашэннем гарвыканкама № 90 ад 22 красавіка 1977 г. завулкам прысвоена імя Твардоўскага.

**ВУЛІЦА ТУРГЕНЕВА** названа ў гонар Івана Сяргеевіча Тургенева (1818-1883) - рускага пісьменніка-рэаліста, паэта, публіцыста, драматурга, перакладчыка. аднаго з класікаў рускай літаратуры, якія ўнеслі найбольш значны ўклад у яе развіццё ў другой палове XIX ст.



Рашэннем гарвыканкама № 507 ад 17 лістапада 1960 г. новай вуліцы прысвоена імя Тургенева. Побач знаходзяцца вуліцы Крылова, Дастаеўскага і . Жукоўскага.

**ВУЛІЦА УШЫНСКАГА** названа ў гонар Канстаціна Дзмітрыевіча Ушынскага (1824-1870) - рускага педагога, пісьменніка, заснавальніка навуковай педагогікі ў Расіі.

**ВУЛІЦА ЧЭХАВА** названа ў гонар Антона Паўлавіча Чэхава (1860-1904) - рускага пісьменніка, празаіка, драматурга, агульнапрызнанага класіка сусветнай літаратуры, аднаго з самых вядомых драматургаў свету.

Рашэннем гарвыканкама № 50 ад 21 сакавіка 1953 г. частка вуліцы Чыгуначнай перайменавана ў вуліцу Чэхава.

**ВУЛІЦА ШАЎЧЭНКІ** названа ў гонар Тараса Рыгоравіча Шаўчэнкі (1814-1861) - украінскага паэта, вядомы таксама як мастак, празаік, этнограф і рэвалюцыянер-дэмакрат. Літаратурная спадчына Шаўчэнка лічыцца асновай сучаснай украінскай літаратуры і шмат у чым літаратурнай украінскай мовы.

Рашэннем гарвыканкама № 389 ад 27 верасня 1962 г. завулку ў раёне вуліцы Горкага прысвоена імя Шаўчэнка.

**ЗАВУЛАК ШОЛАХАВА** названы ў гонар Міхаіла Аляксандравіча Шолахава (1905-1984) - рускага савецкага пісьменніка і кінасцэнарыста, журналіста, ваеннага карэспандэнта, лаўрэата Нобелеўскай прэміі па літаратуры (1965 г.), Сталінскай прэміі (1941 г.), Ленінскай прэміі (1960 г.), члена АН СССР, двойчы Героя Сацыялістычнай Працы (1967 г., 1980 г.).

Рашэннем гарвыканкама № 57 ад 6 красавіка 1965 г. праезд, які злучае вуліцу Тармасава з завулкам Вясновым, названы завулкам Шолахава.

**ВУЛІЦА ЯКУБА КОЛАСА** названа ў гонар Якуба Коласа (1882-1956) - беларускага савецкага пісьменніка, паэта, перакладчыка, аднаго з класікаў і заснавальнікаў новай беларускай літаратуры, грамадскага дзеяча, народнага паэта Беларускай ССР, акадэміка АН Беларускай ССР, члена Саюза пісьменнікаў СССР.

Рашэннем гарвыканкама № 233 ад 30 жніўня 1956 г. новай вуліцы прысвоена імя Якуба Коласа.

**ВУЛІЦА ЯНКІ КУПАЛЫ** названа ў гонар Янкі Купалы (1882-1942) - беларускага паэта і перакладчыка, драматурга, публіцыста, класіка беларускай літаратуры, народнага паэта БССР (1925 г.), акадэміка АН БССР (1928 г.) і АН УССР (1929), лаўрэата Сталінскай прэміі першай ступені (1941).

**ЗАВУЛАК ЯСЕНІНА** названа ў гонар Сяргея Аляксандравіча Ясеніна (1895-1925) - рускага паэта, лірыка.

Рашэннем гарвыканкама № 57 ад 6 красавіка 1965 г. завулку, размешчанаму ў раёне вуліцы Чыгуначнай, прысвоена імя Ясеніна.

*Няма ў Кобрыне вуліцы імя К. Г. Паўстоўскага, які жыў у нашым горадзе ў 1915 годзе і пазней у сваіх успамінах пісаў аб Кобрыне. Яго ўразіла мноства дахаў у цэнтры горада, крытых чырвонай чарапіцай.*

*Вуліца Твардоўскага ёсць у горадзе, а вуліца імя пісьменніка Барыса Лявонцьевіча Гарбатава адсутнічае. Але ж мы памятаем, што ў верасні 1939 года падчас вызваленчага паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь разам з перадавымі часцямі 4-й арміі, якая прасоўвалася на захад, у Кобрын прыбыла рэдакцыя газеты «Часовой Родины». Сярод яе супрацоўнікаў былі два спецыяльныя карэспандэнты, ужо вядомыя ў той час пісьменнік Б. Л. Гарбатаў і паэт А. Т. Твардоўскі. Яны пасяліліся ў хаце № 1 па вул. Суворава і жылі тут у кастрычніку - лістападзе 1939 года. Тым часам у Кобрыне пачала выдавацца павятовая газета «ТРУД», і Барыс Гарбатаў з Аляксандрам Твардоўскім дапамаглі наладзіць выпуск гэтай газеты.Чаму ж не быць вуліцы імя вядомага рускага савецкага пісьменніка, сцэнарыста Гарбатава?*

# Падзеі

*Біяграфія нашага горада цесна звязана з са слаўнымі старонкамі гісторыі, якія авеяны гераічным мінулым.*

**ВУЛІЦА 17 ВЕРАСНЯ** названа ў гонар распараджэння ўрада СССР ад 17 верасня 1939 г., у адпаведнасці з якім тэрыторыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны былі далучаны да Савецкага Саюза. На гэтай вуліцы знаходзіцца Спаскі манастыр - найбольш старажытны помнік праваслаўнага царкоўнага будаўніцтва Кобрына.



**ВУЛІЦА 9 МАЯ** названа ў гонар свята перамогі СССР над нацысцкай Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гг.

У 1965 г. да 20-годдзя з дня Перамогі па рашэнні выканкама № 98 ад 6 мая вуліца Паркавая была перайменавана ў вуліцу 9 Мая.

**ВУЛІЦА 50 ГАДОЎ БССР** названа ў гонар 50-годдзя Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (скарочана БССР) - саюзнай рэспублікі СССР.

Рашэннем № 317 ад 11 снежня 1968 г. новая вуліца ў раёне Цагельнай і Гагарына названа 50 гадоў БССР.

**ВУЛІЦА 700-ГОДДЗЯ КОБРЫНА** названа ў гонар 700-годдзя з часу першага ўпамінання Кобрына ў Іпацьеўскім летапісе.

Рашэннем гарвыканкама № 214 ад 19 жніўня 1987 г. вуліцы і плошчы прысвоена найменне імя 700-годдзя Кобрына.

**ВУЛІЦА БЕЛАРУСКАЯ** названа ў гонар Беларусі. Знаходзіцца недалёка ад ракі Мухавец (у старай частцы горада).

На вуліцы знаходзяцца ДЮСШ па вяслярных відах спорту, а побач - пляж.



**ВУЛІЦА ДЗЕКАБРЫСТАЎ** названа ў гонар удзельнікаў паўстання на Сенацкай плошчы ў Санкт-Пецярбургу ў снежні 1825 г.



Рашэннем гарвыканкама № 193 ад 15 лістапада 1948 г. вуліца носіць сучасную назву - Дзекабрыстаў.

**ВУЛІЦА ДРУЖБЫ** ў Кобрыне названа ў гонар польска-савецкага сяброўства. У 80-х гадах XX ст. у горадзе Кобрыне было шмат польскіх будаўнікоў фірмы «Энэргаполь», якія сваёй працай разлічваліся за пастаўкі Польшчы нафты і газу. Характэрна, што і

нафтаправод завецца «Дружба». Пра польскіх будаўнікоў нагадваюць дзевяціпаверховыя дамы, пабудаваныя імі.



**ВУЛІЦА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАЯ** названа ў гонар Першага Інтэрнацыянала (афіцыйная назва Міжнароднае таварыства працаўнікоў) - першай масавай міжнароднай арганізацыя працоўнага класа, заснаванага 28 верасня 1864 г. у Лондане.



**ВУЛІЦА КАСТРЫЧНІЦКАЯ** названа ў гонар Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г.



У музеі імя А. В. Суворава захоўваюцца дзве паштоўкі пачатку XX ст., на якіх адна і тая ж вуліца падпісана рознымі назвамі - Мяшчанская і Гродзенская. Абедзве паштоўкі аддрукаваны ў Кобрынскай прыватнай друкарні. Можна выказаць здагадку, што нейкі час вуліца Кастрычніцкая (сучасная назва) звалася Гродзенскай. У польскі перыяд 1921-1939 гг. вул. Мяшчанскую назвалі Кобрынскай. У 1939 г. гэта вуліца стала Кастрычніцкай.

**ВУЛІЦА МОПРАЎСКАЯ** названа ў гонар Міжнароднай арганізацыі дапамогі барацьбітам рэвалюцыі - міжнароднай дабрачыннай арганізацыі, створанай Камінтэрнам.

**ВУЛІЦА ПЕРШАМАЙСКАЯ** атрымала сваю назву ў гонар свята 1 Мая – Міжнароднага дня салідарнасці працоўных. Гэтае свята вядзе свой пачатак з падаўлення чыкагскай гарадской паліцыяй 1 мая 1886 г. беспарадкаў, якія ўспыхнулі падчас дэманстрацыі мясцовых рабочых з патраба-ваннямі 8-мі гадзіннага працоўнага дня і прывяло да масавых ахвяраў сярод дэманстрантаў. Праз тры гады Парыжскі кангрэс II Інтэрнацыяналу назваў 1 мая Днём салідарнасці працоўных.



**ВУЛІЦА ПІЯНЕРСКАЯ** названа ў гонар Усесаюзнай піянерскай арганізацыі імя У. І. Леніна. Характэрна, што вуліца пачынаецца праз дарогу ад гімназіі (былая СШ № 5), у якой стаяў помнік школьніцы з кнігай у руцэ і піянерскім гальштукам на шыі.



**ВУЛІЦА ПРАЛЕТАРСКАЯ** названа ў гонар працоўнага класа (пралетарыята). Адна з самых доўгіх вуліц горада Кобрына (па Яндэкс-карце каля 5 км). Побач размешчаны Прывак-зальная вуліца і вуліца Чыгуначная. Злучана з вуліцай Леніна.

На вуліцы размешчаны ААТ «Кобрынскі інструментальны завод «СІТОМА» .



**ВУЛІЦА САВЕЦКАЯ** названа ў гонар усталявання Савецкай улады. Звычайна вуліцы з гэтай назвай размешчаны ў цэнтры гарадоў і вёсак. Гэта адна з самых распаўсюджаных назваў вуліц на тэрыторыі былога СССР.



## Мірныя, дружныя

*Наш горад добразычлівы як да сваіх гаспадароў, так і да яго гасцей. Напэўна, таму ў ім ёсць вуліцы і завулкі з наступнамі імёнамі:*

Завулак Добры
Завулак Дружны
Завулак Мірны
Завулак Спакойны
Завулак Ціхі
Вуліца Дружбы
Вуліца Міра

## Геаграфічныя

Вуліца Андронаўская
Завулак Астраўлянскі
Вуліца Барысаўская
Завулак Брылёўскі
Вуліца Далубоўская
Завулак Дзівінскі
Завулак Заходні
Вуліца Камянецкая
Вуліца Канеўская
Вуліца Кахульская
Вуліца Кіселявецкая
Вуліца Лівенская
Завулак Магдалінскі
Вуліца Мопраўская

Завулак Мухавецкі
Вуліца Палеская
Вуліца Паўднёвая
Вуліца Паўночная
Завулак Тэвельскі
Вуліца Усходняя
Вуліца Ціхарэцкая

## Працоўныя,прамысловыя

Завулак Будаўнічы
Вуліца Гандлёвая
Завулак Ганчарны
Завулак Завадскі
Завулак Калгасны
Завулак Паліграфічны
Вуліца Прамысловая
Вуліца Працоўная
Завулак Пуцейскі
Завулак Рабочы
Вуліца Саўгасная
Вуліца Фабрычная
Вуліца Чыгуначная
Вуліца Цагельная
Завулак Цалінны

## Светлыя, сонечныя

Вуліца Прамяністая
Завулак Светлы
Завулак Сонечны
Завулак Утульны
Вуліца Чыстая
Завулак Ясны

## Новыя, сучасныя

Вуліца Навасёлаў
Вуліца Новая
Вуліца Сучасная

# Водныя

Завулак Азёрны
Завулак Зарэчны
Завулак Крынічны
Завулак Прыбрэжны
Вуліца Берагавая
Вуліца Зарэчная
Вуліца Ключавая
Вуліца Набярэжная

# Спартыўныя

Вуліца Спартыўная
Вуліца Стадыённая

# Зорныя, нябёсныя

Завулак Авіяцыйны
Вуліца Аэрадромная
Вуліца Верталётная
Вуліца Зорныя
Вуліца Касманаўтаў
Завулак Лётны
Завулак Радужны

*У Кобрыне ёсць «смачныя», «фруктова-ягадныя» вуліцы і завулкі: Бруснічная, Клубнічная, Малінавая, Вішнёвы, Абрыкосавы, Яблыневы... А як прыемна блукаць па Каштанавай і Ракітнай вуліцам, зазірнуць у Бэзавы завулак, пастаяць на Альховай…*

*Можна ўпэўнена сказаць, што некаторыя вуліцы Кобрына названы, як у песні «Пройдусь по Абрикосовой, сверну на Виноградную и на Тенистой улице я постою в тени...».*

# Фруктава-ягадныя

Завулак Абрыкосавы
Завулак Агародны
Вуліца Бруснічная
Завулак Вінаградны
Завулак Вішневы
Завулак Грушавы
Вуліца Клубнічная

Вуліца Малінавая
Завулак Садовы
Завулак Ураджайны
Завулак Фруктовы
Завулак Яблыневы

## Кветкавыя

Вуліца Васільковая
Завулак Верасковы
Завулак Кветкавы
Завулак Рамонкавы

## Вуліцы-дрэвы

Вуліца Альховая
Завулак Бэзавы
Завулак Бярозавы
Вуліца Бяроставая
Завулак Вярбовы
Вуліца Каштанавая
Завулак Кляновы
Вуліца Лясная
Вуліца Паркавая
Завулак Рабінавы
Вуліца Ракітная
Вуліца Сасновая
Вуліца Тапаліная
Вуліца Хвойная
Завулак Чаромхавы
Вуліца Ясянёвая

# Спіс крыніц


**Выписки** из решений исполкома Кобринского райсовета депутатов трудящихся, Кобринского горсовета депутатов трудящихся об изменениях названий улиц и площадей Кобрина в период с 1948 по 2000 гг. / Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 502.

**Инвентарные** книги домовладений за 1946-1948 гг. / Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 2. Д. 237.

**Улицы** Кобрина : научная справка / Кобринский военно-исторический музей им. А. В. Суворова. – Кобрин, 2005.

**Их именами** названы : энциклопедический справочник. - Минск : БелСЭ, 1987. – 711 с.

**Памяць.** Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск : БЕЛТА, 2002. – 622 с.

**Ревизия** Кобринской экономии 1563 г. - Вильно, 1876.

**У пошуках** страчанага : гісторыя Беларусі ў старых паштоўках / аўтар тэксту А. М. Карлюкевіч ; паштоўкі У. А. Ліхадзедава. – Мінск : Литература и Искусство, 2007. – 239 с : іл.

Гл. на с. 40-41.

**Целеш, В.** Гарады Беларусі на старых паштоўках /Вячка Целеш. – Мінск : Беларусь, 2014. – 335 с : іл.

Гл. на с. 175-180.

**Белов, Д.** Где эта улица, где этот дом? / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. – 2015. – 25 красавіка. – С. 1, 2.

**Казакова, А**. Где эта улица, где этот дом… / Анна Казакова // Кобрин-информ. – 2015. – 26 февраля. – С. 7.

**Кондрашук, Н.** Вот эта улица, вот этот дом… / Наталья Кондрашук // Кобрин-информ. – 2015. – 16 апреля. - С. 3.

**Ніжнік, Н.** Прыемна жыць у еўрапейскім горадзе / Наталля Ніжнік // Кобрынскі веснік. – 2015. – 25 верасня. – С. 3.

**Федарович, И.** Поднимаются новые микрорайоны **/** Игорь Федарович // Кобрынскі веснік. – 2011. – 21 мая. – С. 2.

**Жук, Е.** Князь, княгиня и тюльпаны / Елена Жук // Вечерний Брест. – 2011. – 15 июня. – С. 8. – Площадь им. Ленина получила вторую молодость.

**Жук, Е.** Сюрприз для пешеходов / Елена Жук // Вечерний Брест. – 2009. – 28 июня. – С. 3. – Улица Суворова стала пешеходной.

**Кирилюк, П. В**. Новая жизнь Замковой площади / П. В. Кирилюк ; [беседовала] Елена Курига // Кобрин-информ. – 2009. – 22 января. – С. 2.

**Назарук, Т.** Улицы и площади Кобрина: история и современность / Татьяна Назарук // Кобрин-информ. – 2009. – 16 июля, 23 июля. – С. 25.

**Радивонюк, В. Н.** Улицы города / В. Н. Радивонюк // Кобрин-информ. – 2009. – 23 октября. – С. 2.

**Савчук, М**. Улица или переулок / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. – 2009. – 5 февраля. – С. 3.

**Шевченко, А**. …И будет в Кобрине бульвар / Алла Шевченко // Кобрин-информ. – 2009. – 12 марта. – С. 3.

**Белов, Д.** Меняется в мае и Первомайская / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. – 2008. – 21 мая. – С. 2.

**Где** эта улица, где этот дом / фото и репродукции Анатолия Шугая // Кобрынскі веснік. – 2007. – 21 ліпеня.

**Васюк, Н.** Альтернативный взгляд / Наталья Васюк // Кобрин-информ. – 2006. – 9 ноября. – С. 2. - О модернизации ул. 700-летия Кобрина.

**Пянко, А.** Преображается улица / Алексей Пянко // Кобрынскі веснік. – 2006. – 20 мая. – С. 2. – Благоустройство улицы 700-летия Кобрина.

**Мурашкина, М.** Имена земляков – улицам города / Мария Мурашкина // Кобрынскі веснік. – 2005. – 22 кастрычніка.

**Васюк, Н.** Будущее старинной площади / Наталья Васюк // Кобрин-информ. – 2004. – 28 октября.

**Жук, Е.** История меняет имена / Елена Жук // Кобрынскі веснік. – 2003. – 5 лпеня.

**Мартынов, А.** Что в имени твоем, улица? / Алексей Мартынов // Кобрынскі веснік. – 2002. – 27 ліпеня.

**Мартынов, А.** Довоенные улицы Кобрина : страницы истории / А. Мартынов // Кобрынскі веснік. – 1993. – 9 студзеня. – С. 2.

**Мартынов, А.** «Мещанская улица» : старонкі гісторыі / А. Мартынов // Кобрынскі веснік. – 1993. – 17, 21 красавіка.

**Мартынов, А. М.** Главная площадь / А. М. Мартынов // Кобрынскі веснік. – 1991. - 14 мая.

**Пліско, Н. М.** Каб уміраючы ўвасобіцца / Н. М. Пліско // Камуністычная праца. – 1988. - 7 июля.

**Хільчук, М.** Свята вуліцы імя Ф. Э. Дзяржынскага / Марыя Хільчук // Камуністычная праца. – 1986. – 2 кастрычніка. – 1, 2.

**Пліско, Н.** Гарадскія вуліцы расказваюць / Н. Пліско // Камуністычная праца. – 1982. – 9 лютага.

**Мартынаў, А.** Галоўная плошча : з гісторыі горада / А. Мартынаў // Камуністычная праца. – 1972. – 24 ліпеня.

**Мартынаў, А.** Вуліца, якая носіць імя У. І. Леніна / А. Мартынаў // Камуністычная праца. – 1970. – 4 красавіка.

# ЗМЕСТ


**АД СКЛАДАЛЬНІКА** 3

**I. ВУЛІЦЫ ГОРАДА РАСКАЗВАЮЦЬ** 5

1.1 Назвы вуліц Кобрына ў мінулым 5

1.2 Схема змяненняў назваў вуліц, плошчаў Кобрына 7

1.3 Артыкулы А. М. Мартынава, Н. М. Пліско – аб гісторыі вуліц Кобрына 13

1.4 Фотагалерэя даваенных вуліц 30

**II. Я ІДУ ПА ГОРАДУ, ПА ЗНАЁМАЙ ВУЛІЦЫ…** 36

2.1 Сучасныя назвы вуліц горада : агульны пералік назваў вуліц, завулкаў, плошчаў (на беларускай і рускай мовах) 36

2.2 Сістэматызацыя вуліц 42

2.2.1 Персаналіі 42

*дзяржаўныя, палітычныя дзеячы* 43

*гістарычныя асобы* 44

*ваенныя дзеячы* 45

*героі Вялікай Айчыннай вайны* 47

*касманаўты, лётчыкі* 51

*навукоўцы* 53

*пісьменнікі, літаратары* 54

2.2.2 Падзеі 59

2.2.3 Мірныя, дружныя 63

2.2.4 Геаграфічныя 63

2.2.5 Працоўныя, прамысловыя 64

2.2.6 Светлыя, сонечныя 64

2.2.7 Новыя, сучасныя 64

2.2.8 Водныя 65

2.2.9 Спартыўныя 65

2.2.10 Зорныя, нябёсныя 65

2.2.11 Фруктова-ягадныя 65

2.2.12 Кветкавыя 66

2.2.13 Вуліцы-дрэвы 66

**СПІС КРЫНІЦ** 67

Даведачнае выданне

Серыя «Ведай і любі свой горад»

# ІМЁНЫ ТВАІХ ВУЛІЦ,
# ГОРАД КОБРЫН

даведнік-тур па вуліцах

Складальнік:
Курачук Святлана Дзмітрыеўна

Камп’ютарная вёрстка С. Д. Курачук
Камп’ютарны дызайн вокладкі П. С. Грыневіч

На беларускай, рускай мовах

Надрукавана на камп’ютарна-выдавецкай сістэме
Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі

Вул. Маршала Жукава, 12, 225306, Кобрын
Цэнтральная раённая бібліятэка дзяржаўнай установы культуры
«Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»
E-mail: kobrinlib@gmail.com
www.krcls.by